Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Кавыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не гарантуюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	7 р. — к.

Зьмена адрасу: іншагародніх—20 к. мясцовых—10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капітэрэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок капітэрэлі наперад тэксту 1 р. — к.
За радок капітэрэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпецыяльныя на 50 проц. даражэй.
Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . 15 „
Бесправоўны і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . 5 „
Публікацыі ЗАГС—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-мы ГОД ВЫДАЧЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 252 (2144) Пятніца, 4-га лістапада 1927 г.

Аб выніках кастрычнікавага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Рэзалюцыя пленуму ЦК КП(б)Б.

Заслухаўшы даклад тав. Кнорына аб выніках кастрычнікавага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б цалкам і поўнасьцю ўхваляе ўсе пастановы ЦК і ЦКК і тэзісы ЦК УсеКП(б) да XV партзьезду.

Буйныя посьпехі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, якія дасягнуты да 10-годзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі пад правільным кіраўніцтвам ленінскае партыі і яе ЦК, рашуча разьбіваюць паклёпніцкія сьцьвярджэньні апазіцыі аб згортваньні пралетарыяту, аб наступленьні «палітычнага зморку», аб пераражэньні пралетарскае дыктатуры.

Савецкі Саюз закончыў адбудоўчы пэрыяд ў сваім гаспадарчым разьвіцьці і пад правільным кіраўніцтвам ЦК рашуча прыступіў да рэканструкцыі прамысловасьці і ўсяе народнае гаспадаркі на новай тэхнічнай базе. Правільная палітыка бальшавіцкае ленінскае партыі забясьпечыла бязупыннае ўзрастаньне ўдзельнае вагі прамысловасьці, палепшаньне становішча рабочае клясы і сялянства, узмацненьне саюзу пралетарыяту з сялянскаю беднатою і серадняком супроць кулацтва.

Пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) правільна, выразна паленінску намеціў сыстэму мерапрыёмстваў, якія накіраваны на далейшую індустрыялізацыю краіны, яшчэ большае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва СССР.

Усё большае рэвалюцыянізаваньне рабочае клясы Захаду і прыгнечаных народаў Усходу і нераможнае сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР прывялі да абвастрэньня барацьбы імпэрыялістых за захаваньне сваёй сыстэмы і робяць нямінучай імпэрыялістычную вайну супроць ачага і базы сусьветнае пралетарскае рэвалюцыі—СССР, магчыма ў больш ці менш бліжэйшы час. Асноўныя фактары рэвалюцыйнае барацьбы сусьветнага пралетарыяту пацьвярджаюць бязумоўную правільнасьць палітычнае лініі Камінтэрну і даказваюць абсалютную няўгрунтаванасьць паклёпніцкіх выпадаў апазіцыі, якія вядуць адкрытую барацьбу супроць кампартыі і разам з ворагамі камунізму дабіваюцца расколу Камінтэрну.

Заслухаўшы аб зусім нячуваных ва ўсёй гісторыі бальшавіцкае партыі паводзінах апазіцыі на апошнім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б), Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з абурэньнем асуджае ганебную, перайшоўшую ўсякую мяжу партыйнасьці антыпартыйную раскольніцкую лінію апазіцыі.

Партыя цярпліва чакала, што апазіцыя зразумее свае памылкі і вернецца на рэвалюцыйныя пазіцыі ленінізму.

Гэтага, аднак, не адбылося. Наперакор усім сваім заявам і абяцаньням, апазіцыя ня толькі не адмовілася ад трацкісцкай ідэйнай асновы, ня толькі ня спыніла сваёй разбуральнай фракцыйнай работы, але наадварот, злосна ашукваючы партыю, далей паглыбляе сваю раскольніцкую дзейнасьць.

На данай стадыі перад партыяй стаіць пытаньне ня толькі аб ідэйнай схватцы паміж ленінізмам і трацкізмам унутры партыі, але і пагроза стварэньня новай антыбальшавіцкай партыі. Арганізацыя нелегальнага фракцыйнага апарату, стварэньне нелегальнай друкарні, блёк з беспартыйнымі буржуазнымі інтэлігентамі, апэляцыя да абывательскай вуліцы, ні чым не прыкрытае падтрыманьне ультра-левых і ультра-правых рэнэгатаў заграніцаю, непасрэдных ворагаў УсеКП(б) і СССР,—усё гэта неабвяржэльна сьведчыць аб тым, што апазіцыя перарастае з сацыял-дэмакратычнага ўхілу ва ўсеКП(б) у лёгкі меншавізм, што апазіцыя ў сваіх формах і мэтадах барацьбы дайшла да таго пункту, які раўназначны стварэньню другое партыі. Гэтага бальшавіцкая ленінская партыя цярпець больш ня можа.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б ухваляе пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб выключэньні т. т. Троцкага і Зіноўева з складу ЦК.

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б лічыць што фракцыйная барацьба апазіцыі, перарастаючая ў арганізацыю другой партыі, і адстойваньне ёю сваіх ліквідатарскіх поглядаў не сумяшчальны з прабываньнем у радах бальшавіцкай партыі.

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б упэўнен, што ўсе бяз выключэньня парт'ячэйкі КП(б)Б адкінуць у сьмяцьцёвую скрыньку гісторыі ўсю трацкісцкую апазицыю, ня даўшы ёй піводнага голасу на надыходзячы XI зьезд КП(б)Б і XV зьезд УсеКП(б).

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б зацьвярджае пастанову бюро ЦК ад 29 кастрычніка 1927 году аб неадкладным пачатку і парадку правядзеньня дыскусіі ў КП(б)Б па тэзісах ЦК УсеКП(б) да XV партзьезду.

Няхай жыве сталёвае адзінства бальшавіцкае партыі!

Няхай жыве аднадушны XI зьезд КП(б)Б і XV зьезд УсеКП(б).

Замежны гандаль за 10 гадоў.

Сярод камандных вышынь сацыялістычнага будаўніцтва замежны гандаль займае адно з першых месц. Манапонія замежнага гандлю дазваляе нам урэгуляваць у інтарэсах пралетарыяту эканамічныя ўзаемаадносіны Савецкага Саюзу з сусьветнай гаспадаркай, узаемаадносіны дзьвюх у корані процілеглых сацыяльна-эканамічных сыстэм: сацыялістычнае і капіталістычнае. Ня дзіва таму, што палітыка сусьветнае буржуазеі і яе перадавога застральшчыка Англіі, накіроўвалася да гэтае пары ў першую чаргу проці манаполіі замежнага гандлю, бо зрыў манаполіі азначаў бы падначаленьне Савецкага Саюзу інтарэсам капіталу.

Сусьветны капітал да Кастрычнікавае рэвалюцыі паступова ператвараў царскую Расею ў сваю калёнію; чужаземнаму капіталу належала большая частка прамысловых прадпрыёмстваў Расеі, а даўгавыя абавязацельствы царскага ўраду забясьпечвалі чужаземнаму капіталу ўмешваньне ва ўнутраныя справы краіны. Замежны гандаль царскае Расеі, таму, павінен быў будавацца на выгодным для сусьветнага капіталу злучэньні экспорту харчовых прадуктаў і сыравіны, і ўвозу спажывецкіх тавараў і машын. Пры гэтым увоз павінен быў значна перавышаць вываз для таго, каб пакрываць процанты па ўкладзеных у Расеі чужаземных капіталах і доўгавых абавязацельствах царскага ўраду. Падаткамі царскі ўрад падганяў сялянства да ўзмоцненага вывазу хлеба, абгрунтаванаму на недаданьні ўнутры краіны, асабліва сялянства. У тойжа час для нашае бацькаўскае буржуазеі і шляхты ўвозіліся з-заграніцы рэчы раскошы і гатовыя вырабы вышэйшых гатункаў, якія не магла вырабляць расейская прамысловасьць.

Атрымаўшы такую спадчыну ў гаіне замежнага гандлю, рабоча-сялянскі ўрад Саюзу ў працягу першых трох гадоў свайго існаваньня павінен быў вытрымліваць інтэрвэнцыю і блёкаду дзяржаў Антанты. У гэтыя гады цяжка было і думаць аб плянавай набудове гандлю. Вывозіць ня было чаго, а ўвозіць можна было толькі самае неабходнае. Так, напр., у 1913 годзе наш вываз складаў каля 1 з палов. міліёнаў руб., а наш увоз 1,4 міліярды руб., у 1920 г. увесь вываз па Эўрапейскай граніцы толькі мала перавышаў міліён руб., а прывоз складаў па даваенных цэнах 28 міліярдаў р. З тае пары пачынаецца паступовае аднаўленьне замежнага гандлю Савецкага Саюзу.

У 1921-22 г. вываз складаў (па даваенных цэнах) 63916 тыс. руб.—увоз—270856 тыс. руб.; у 1926-27 г. (напярэдні) вываз складзе 554000 т. руб. (па сучасных цэнах 767000 т. руб.), увоз 487000 тыс. руб. (па сучасных цэнах) 707000 т. руб.

Такім чынам, мы бачым, што за 6 гадоў замежны гандаль Савецкага Саюзу павялічыўся па даваенных цэнах больш чымся ў 3 разы, прычым вываз павялічыўся амаль што ў 9 разоў. Арганізацыя нашага экспорту яўляе сабою першарадную паслугу савецкага ўраду; калі мы пачыналі ў 1921 годзе гандляваць, капіталісты ня верылі, што мы будзем мець магчымасьць плаціць за закупленыя намі заграніцаю тавары, бо нам ня будзе чаго экспартаваць. Мы перамаглі вялічэзныя цяжкасьці на экспортным фронце, але перад намі ў працягу бліжэйшага дзесяцігодзьдзя ўсё яшчэ стаіць задача пашырэньня вывазу, паленшаньня якасьці экспартных тавараў і зьніжэньня накладных выдаткаў у замежным гандлі.

Калі наш вываз усё яшчэ вельмі значна адстае ад даваеннага, дык гэта тлумачыцца тым, што савецкі ўрад грунтоўна зьмяніў палітыку царскай Расеі ў галіне замежнага гандлю. Мы вывозім зараз толькі лішкі, якія застаюцца пасьля здаволеньня попыту ўнутранага рынку, не адбіраючы ад рабочых і сялян Саюзу хлеба для вывазу заграніцу. З гэтай прычыны галоўнае значэньне ў нашым вывазе маюць такія прадукты, як лесаматар'ялы, нафта, марганец, лён, пушніна, лекавае сыравіна.

У сучасны момант мы ўзмоцнена разьвіваем вываз другарадных, экспортных тавараў. Прывоз з заграніцы рэчаў раскошы і спажывецкіх тавараў мы спынілі: мы прывозім замест гэтага калёніяльную сыравіну для патрэб нашай прамысловасьці і фабрычнае абсталяваньне, якое дасьць магчымасьць пашырыць нашу прамысловасьць і на аснове індустрыялізацыі Савецкага Саюзу зьменшыць нашу залежнасьць ад сусьветнага капіталізму.

Манапонія замежнага гандлю дае магчымасьць будаваць прывоз і вываз на аснове пэўнага пляну, у адпаведнасьці з патрэбамі народнай гаспадаркі. Дзякуючы манаполіі замежнага гандлю мы ведаем, колькі мы можам вывезьці, колькі мы здольны прывезьці, якія крэдыты мы можам атрымаць заграніцаю і як мы будзем з імі разьлічвацца. Таму найбольш дальнабачныя буржуазныя палітыкі-амэрыканцы, якія згадзіліся з няўхільнасьцю існаваньня савецкага ладу, бачаць у манаполіі замежнага гандлю вядомую гарантыю платаздольнасьці Савецкага Саюзу. Будуючы плянава свой замежны гандаль, савецкі ўрад не ўскладзе на сябе ніякіх абавязацельстваў, якіх ён ня здолеў-бы выканаць.

Апазіцыі ня удасца развяліць камсамол.

УсеЛКСМ уваходзіць у дыскусію без процістаўленьня сябе ленінскай партыі.

ДЭЗАРГАНІЗАТАРАМ ЛЕНІНСКАГА ВЫХАВАНЬНЯ МОЛАДЗІ ДАСЬЦЬ АДПОР.

Пастанова пленуму ЦК УсеЛКСМ.

МАСКВА Пленум УсеЛКСМ ад 29-га кастрычніка аднагодна ўхваліў рэзалюцыю, у якой, між іншым гаворыцца: палітычны напрамак апазіцыі, напрамак трацкізму ўжо зараз нічога агульнага ня мае з сапраўдным ленінскім напрамкам. Бязумоўна, што сацыял-дэмакратычны ўхіл апазіцыі ператвараецца ўжо ў выразны меншавізм. Перадзьездаўская дыскусія і шырокае абмеркаваньне пытаньняў зьезду партыяй канчаткова выкрые антыленінскі характар апазіцыі, вызвіць волю ўсяе партыйнае масы ад абароны адзінства партыі і яе бальшавіцкае лініі і паставіць перад апазіцыяй пытаньне рубам: альбо падпарадкаваньне пастановам партыі, альбо вон з партыі.

Сваю дэзарганізатарскую дзейнасьць апазіцыя распаўсюдзіла таксама на УсеЛКСМ.

УсеЛКСМ нікол і не адхіляўся ў бои ад барацьбы ленінскае партыі проці антыбальшавіцкіх ухілаў і плыняў. Камсамол павінен разам з усёй партыяй даць апошні рашучы адпор трацкісцкай фракцыі і канчаткова выкрыць яе здрадніцкі апартунізм. Аднак, удзел камсамолу ў абмеркаваньні асноўных пытаньняў партыйнага жыцьця на можа быць зьвязан з якім-небудзь процістаўленьнем камсамолу партыі, ці з аказаньнем нажыму на ленінскую лінію партыі. Камсамол удзельнічае ў дыскусіі ў мэтах бальшавізацыі выхаваньня сваіх членаў і іх ідэйнае загартаванасьці, рашуча змагаючыся з усімі тэндэнцыямі раўнапраўя камсамолу з УсеКП(б), якія ўсялякі падахвочваюцца ўсёй дэзарганізатарскай працай апазіцыі ў шэрагах УсеЛКСМ.

ЦК УсеЛКСМ з свайго боку стаіць на рашучай пазіцыі падтрыманьня ленінскага ЦК партыі і рашучае барацьбы проці трацкісцкае фракцыі.

Пленум ЦК УсеЛКСМ далучаецца да пастановы апошняга пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб выключэньні Троцкага і Зіноўева з ЦК.

Пленум таксама ўхваляе вызначаны апошнім пленумам ЦК і ЦКК напрамак дадалейшага разьвіцьця краю, выяўлены ў праектах тэзісаў 15-га партыйнага зьезду.

ЦК УсеЛКСМ перакананы, што ленінскі камсамол аднагодна, як і ў папярэдніх партыйных дыскусіях, падтрымае бальшавіцкі напрамак проці трацкісцкага і выкажацца за бальшавіцкую партыю проці раскольнікаў і дэзарганізатараў ленінскіх шэрагаў.

Спыняючыся на пытаньні працы моладзі рэзалюцыя называе паклёпам заявы трацкісцкае апазіцыі аб парушэньні настрычнікавых заваёў рабочае моладзі і праведзеньня рацыяналізацыі за кошт пралетарскага мададзяка. Цэнтральная праблема, пастаўленая перад камсамолам 14-ым зьездам УсеКП(б), праблема злучэньня асабістых і групавых інтарэсаў моладзі зі інтарэсамі пралетарыяту ўцэлым, гэтая праблема камсамолу да 15-га партыйнага зьезду ў асноўным вырашана. Нічэмным паклёпам выглядае ў гэтых умовах прытыка апазіцыяй ідэйна-палітычнага зьместу жыцьця працы камсамолу. УсеЛКСМ праводзіць сваю вялізарнае значнасьці працу па бальшавіцкім выхаваньні мае моладзі, ня толькі перамагаючы шмат цяжкасьцяў, якія грунтуюцца на тэхнічным і культурным заняпадзе нашага краю, але і проці апазіцыі, наперакор яе процідзейнічаньню. Усім сваім ідэйным зьместам і арганізаванай дзейнасьцю апазіцыя падрывае асновы ленінскага выхаваньня моладзі і дэзарганізуе яе шэрагі. Ва ўмовах абвостранае барацьбы за моладзь апазіцыя аб'ектыўна дапамагае на класаваму пралетарскаму выхаваньню моладзі, а трэцяй сіле, сіле капіталістычных элемэнтаў, якая спрабуе ў мэтах буржуазнае рэстаўрацыі паслабіць уплыў бальшавіцкае партыі на масы працоўнае моладзі СССР.

Задача ленінскага выхаваньня моладзі застаецца галоўнаю задачаю камсамолу ў сучасны момант. Сучасныя абставіны асабліва падкрэсьліваюць неабходнасьць рашучае барацьбы з рознымі дробнабуржуазнымі ўплывамі. Аднак, рашучае разгортваньне гэтае барацьбы немагчыма бяз поўнае канчатковае перамогі трацкісцкае апазіцыі.

Таму незамірымая барацьба з трацкізмам і яго ідэйнае выкрываньне ў масах моладзі ёсьць цэнтральная задача камсамолу ў сучасны момант.

ВЫКЛЮЧЭНЬНЕ КАМСАМОЛЬЦАЎ-ФРАКЦЫЯНЭРАЎ.

КІЕЎ, 2-XI. Бюро акруговага камітэту камсамолу выключыла з камсамолу за фракцыйную працу 13 чалавек і 3-м абвясьціла выгавар.

Выключаныя арганізавалі падпольныя гурткі, сходы якіх адбываліся па канспіратыўных кватэрах, з членаў якіх браліся ўзносы, перадавалі беспартыйным сакрэтныя партыйныя дакумэнты і распаўсюджвалі апазіцыйныя матар'ялы.

Камунары Ленінграду асудзілі апазіцыю.

ЛЕНІНГРАД. 1 лістапада на 13 буйнейшых фабрычна-заводзкіх калектывах Ленінграду адбыліся партыйныя сходы, прысьвечаныя разбору тэзісаў да 15-га зьезду партыі.

На сходах прысутнічала 6399 чал. —82 проц. усіх членаў калектываў. Сходы адрозьніваліся вялікай актыўнасьцю. Вялікі лік прамоўцаў—рабочыя ад станку. Пераважная колькасьць галасоў была пададзена за рэзалюцыі, ухваляючыя працу ЦК і прызнаючыя правільнымі тэзісы ЦК. Проці рэзалюцый галасавала ўсяго 81 чал. За рэзалюцыі, прапанаваныя апазіцыяй, галасавала 70 чал.

На калектыве «Чырвонага Пуцілаўца» апазіцыйныя гастралёры Бакаеў і Тарханаў в кучкаю прыхільнікаў спрабавалі сарваць сход. Абурэныя камунары затрабавалі неадкладнага спыненьня агідных выпадаў, папярэдзіўшы апазіцыянэраў, што ў адваротным выпадку яны неадкладна будуць выключаны з партыі.

Куды ідзе ангельская рабочая партыя.

КАНСЭРВАТАРЫ І ЛІБЭРАЛЫ Ў ВЫБАРЧЫМ «РАБОЧЫМ» СЬПІСЕ.

ЛЁНДАН, 25-X. Каса лібэральнае партыі паноўнілася ўзносам Лейд-Джорджа, які прыблізна складае 300 тысяч фунтаў стэрлінгаў і з іншымі партыйнымі паступленьнямі цалком здавальняючы для пакрыцьця выбарчых выдаткаў ня менш чымся на 500 мандатаў лібэральнае партыі.

Гэта выклікае непакой у колах рабочае партыі. З прычыны фінансавых цяжкасьцяў, выкліканых новым законам аб прафсаюзах, які ўскладзе збор адлікаў на палітычныя мэты, выканком рабочае партыі вядзе перамовы з некаторымі асобамі, якія прапануе выставіць іх кандыдатуру ад рабочае партыі з умовай, каб яны ўзялі на свой кошт усе выбарчыя выдаткі. Ужо цяпер сьпіс кандыдатаў рабочае партыі запоўнен прозьвішчамі лібэралаў і кансэрватараў.

РАЗГОН РАБОЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

ЛЁНДАН, 25-X. Водлуг паведамленьня „Сэндэй Уорнэрс", выканком рабочае партыі выключыў з партыі арганізацыю рабочае партыі ў Кельвінгрувэ (райён Глязко) за тое, што яна выставіла сваіх кандыдатам камуніста Фэргюсона проці кандыдата правага крыла рабочае партыі на надаўніх дадатковых выбарах у Андэрстоне.

Апрача таго, выканком рабочае партыі дамогся выключэньня з глязгоўскае рады прафсаюзаў самога Фэргюсона, старшыні і сэкратара незалежнае рабочае партыі Кельвінгрувэ і падтрымліваючых Фэргюсона 8 членаў выканаўчага камітэту рады прафсаюзаў. Арганізован новы выканком рады прафсаюзаў, якому даручана зрабіць поўнае расьсьледаваньне справы і выключыць і іншых членаў рады, якія падтрымліваюць Фэргюсона.

Посьпехі рабочае партыі на выбарах.

ЛЁНДАН, 1-XI. Сёньня ва ўсім краі за выключэньнем Лёндаскае акругі, адбыліся выбары ў муніцыпальныя рады для замяшчэньня выбаўшае часткі членаў муніцыпальных рад. Водлуг апошніх пяноўных вестак, кансэрватары страцілі 63 месцы, лібэралы 21, незалежныя—9, рабочая партыя выйграла 93 месцы.

ЛЁНДАН, 2-XI. Водлуг апошніх вестак, на муніцыпальных выбарах у Англіі рабочая партыя выйграла 124 месцы.

Вынікі выбараў у 150 гарадох; рабочая партыя захавала сваю большасьць у 9-х з гэтых гарадоў, іншу набыла большасьць у 7 гарадох і страціла большасьць у адным горадзе. Такім чынам, рабочая партыя будзе мець большасьць у 15 гарадзкіх муніцыпальных гарадах з ліку 150-ці, што датычыць іншых 135 гарадоў, дык ва ўсіх іншых прамысловых цэнтрах рабочая партыя павялічыла лік сваіх мандатаў.

Тайныя склады зброі ў Індыі.

ЛЁНДАН, 2-XI. Агенцтва Рэйтара паведамляе з Нью-Дэйлі: у Дэагоры паліцыя арыштавала 3-х бэнгальцаў, у якіх выкрыта зброя і амуніцыя. Гэтымі днямі паліцыя ўчыніла во выскі ў некаторых дамох у Лягоры. Алахабадзе і Каупуры, прычым захоплена вялікая колькасьць забаронепае літаратуры, рэвальвэры і матар'ялы для вырабу бомбаў. У зьвязку з вобыскамі некалькі чалавек арыштавана.

БАРАЦЬБА МІЖ КІТАЙСКІМІ МІЛІТАРЫСТАМІ.

Крытычнае становішча Тан-Шэн-Чы.

ШАНХАЙ, 2-XI. Чужаземныя газэты лічаць становішча ў Ханькоу крытычным, бо з поўначы гораду пагражае Ян-Сэн, а з усходу нанкінскае войска. Газэты лічаць магчымым, што райён Ханькоу будзе Тан-Шэн-Чы ў бліжэйшы час эвакуаваны.

ЕН-СІ-ШАН НЕДАЛЁКА АД ПЕКІНУ?

ПЕКІН, 2-XI. З радыё станцыі Тайюнань-Фу (розьдзіцця Ен-Сі-Шана) штодзённа адбываецца перадача прапагандкага характару, прызначаная для дыцлёматычнага корпусу ў Пекіне. У гэтых паведамленьнях гаворыцца, што Шансі не пагражае напад мукдэнцаў, што мукдэнцы страцілі 30 тысяч чалавек, а шансійцы толькі 10 тыс., што шансійцы заўладалі ўсімі стратэгічнымі пунктамі ў ваколіцах Пекіну, і што з прычыны пабыту ў Пекіне чужаземцаў і чужаземнае маемасьці, яны гораду бамбардываць ня будуць.

Дадатковыя мыты.

ПЕКІН, 2-XI. Водлуг паведамленьня агэнцтва Говэн, Чжан-Цзун-Чан, які адчувае патрэбу ў сродках для далейшага працягу кампаніі ў правінцыі Хэнань, увёў у Цзыдзао новыя мыты: на адным даляры ў год з кожнага прыбываючага судна і па адным цэнце з тоны вотазьмяшчэньня таго-ж судна пры кожным асобным наведваньні ім порту Цзыдао.

РАБОЧЫ ПРЭЗЫДЫУМ КЁНІСБЭРСКАГА МАГІСТРАТУ.

БЭРЛІН, 27-X. Большасьцю галасоў камуністаў і сацыял дэмакратаў старшынёю кёнісбэрскага муніцыпалітэту абраны сацыял-дэмакрат. Намесьнікам абраны камуніст і сацыял-дэмакрат, у члены прэзыдуму—камуніст і сацыял-дэмакрат. Пасьля абраньня прэзыдуму, прадстаўнікі буржуазных партый у галасаваньні далейшых пытаньняў ня ўдзельнічалі.

За дзень.

Напярэдадні выбараў у Англіі.

У пачатку 1928 г. у Англіі павінны будуць адбыцца выбары ў парлямант, да якіх ужо зараз пачынае праводзіцца падрыхтоўка.

Кансэрватыўны ўрад Англіі ўсё больш адчувае, што ён траціць глебу пад нагамі, што на будучых выбарах у парлямант ён наўрад ці зьбярэ большасьць галасоў. Закон супроць прафсаюзаў і праэкт рэарганізацыі палаты лёрдаў, галоўным чынам, мелі мэтай узмацніць пазіцыі кансэрватараў за кошт паслабленьня рабочай партыі, якая ў зьвязку з ажыцьцяўленьнем гэтага закону ня зможа зьбіраць сродкі, патрэбныя ёй для таго, каб павесьці падрыхтоўчую кампанію да выбараў.

Апошнія падзеі ў Англіі паказалі кансэрватыўнаму ўраду, што, ня гледзячы на малы шэраг перашкод, рабочая партыя ўсё-ж мае шансы на значнае павялічэньне галасоў у парлямансе. Лепш за ўсё аб гэтым гаворыць вынікі вырабаў у муніцыпалітэтах Англіі, дзе рабочая партыя выйграла 124 месцы. Апроч таго, што рабочая партыя захавала большасьць галасоў амаль ва ў сіх муніцыпалітэтах, дзе яна іх мела раней, яна на гэтых выбарах заваявала большасьць яшчэ ў 7 гарадох. Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што рабочая партыя і зараз на наступных выбарах можа набіць сучасную ўрадавую кансэрватыўную партыю.

Але характэрным зьявішчам на наступных выбарах зьяўляецца тое, што рабочая партыя пачынае ўключаць у свае сьпісы таксама лібэралаў і нават некаторых кансэрватараў. Бюракратычныя лідэры ангельскай рабочай партыі тлумачаць гэта тым, што ў рабочай партыі не хапае ўласных сродкаў для выбарчай кампаніі. Зусім зразумела, што пры іншай палітыцы рабочай партыі гэткія факты не маглі-б мець месца. Толькі таму, што ў апошнія часы пачынае сьціцца грань паміж рабочай партыяй і кансэрватарамі, рабочая партыя магла згадзіцца на гэткую камбінацыю.

Ангельская рабочая партыя ўжо не зьяўляецца левай часткай буржуазнага фронту, але ў сучасных умовах уваходзіць, як актыўны ўдзельнік, і частка буржуазных партый, якія дзейнічаюць у Англіі. Апошні зьезд прафсаюзаў Англіі і рабочай партыі лепш усяго сьцьвердзілі, што рабочая партыя фактычна заключае саюз з кансэрватарамі, г. зн. з буржуазеяй супроць рабочае клясы.

Пры такіх умовах нам яшчэ раз трэба падкрэсьліць, што нават прыход рабочае партыі да ўлады ў Англіі ня можа зьмяніць становішча рабочае клясы і адносін да іх ангельскага ўраду, калі-б ён нават быў рабочым.

Зьезд сацыял-здрадніка ў Аўстрыі.

Гэтымі днямі ў Вене засядаў зьезд аўстрыйскай сацыял-дэмакратыі. Ні ліпнёўскае паўстаньне ў Вене, ні апошнія падзеі, якія разгортваюцца на тэрыторыі Аўстрыі, нічаму не навучылі сацыял-дэмакратаў. Сацыял-дэмакраты нават прымушаны былі адмовіцца і распусьціць «абшчынную паліцыю», бо гэтага патрабавала аўстрыйская рэакцыя праз чужаземных паслоў. Аўстрыйская сацыял-дэмакратыя і зараз нічога не знаходзіць у ліпнёўскім паўстаньні, ня вдае і ня хоча ведаць аб яго сацыяльных карэньнях. Усё гэта ёю разглядаецца як выпадковы факт, аб якім трэба памятаць, але на які ня трэба зьвяртаць ніякай увагі.

Цалкам здрадніцкі характар сацыял-дэмакратаў асабліва выявіўся пры абгаварэньні пытаньня аб дзейнасьці камітэту па стварэньню адзінага прафсаюзнага фронту. Лідэрамі аўстрыйскай сацыял-дэмакратыі спэцыяльна створана была дэманстрацыя ў часе выступленьня прадстаўніка сацыял-дэмакратаў у аб'яднаным камітэце, паказваючы гэтым, што нібы аўстрыйскія рабочыя супроць адзінага прафсаюзнага фронту.

На падставе гэтых ашуканскіх прыёмаў і была ўхвалена пастанова аб тым, што члены сацыял-дэмакратычнай партыі не павінны ўдзельнічаць у аб'яднаным камітэце па садзейнічаньні міжнароднаму адзінству прафсаюзнага руху.

Няхай пабрэшуць...

Правал палітыкі, якая мела на мэце яскрава варожы ў адносінах да нас, як дзяржавы не імпэрыялістычнай і не капіталістычнай, даўся ў знакі некаторым нашым суседзям. Ну, зразумела, што замаганіла перш усяго польская буржуазная прэса, нават поўафіцыёзная. Напрыклад, «Польска Збройна» піша так: «Якісь іншы вецер падуў у Латвіі. Латвія заключыла апошнімі часамі пэўны трактат з адной з суседніх дзяржаў, трактак, які будзіць паважныя перасьцярогі на будучыню. Аддаём голас трэцяй старане далёкай Фінляндыі, якая аб гэтым угаворы на шпальтах свайго ўрадавага органу піша: «Латвія ізалявалася ад Эўропы, каб уцягнуць сябе ў арбіту інтарэсаў Расеі і зрабіць сябе залежнай ад сябе. Трактат, які цяпер заключан, дае бальшавікам усялякія магчымасьці разьвіцьця сваёй акцыі ў Латвіі».

«Варшавянка» — газэта вядомага «хрысьціянскага» дэмакрата Стронскага таксама нездаволена савецка-латвійскім угаворам. Яна піша: «Ніхто не сумлявацца, што зблiжэньне малой Латвіі з Саветамі на гаспадарчым грунце мусіць адбіцца вельмі некарысна на яе палітычнай незалежнасьці У Фінляндыі крок Латвіі ўважаецца за самазабойства, таму што ад гэтай пары Латвія ўваходзіць у арбіту савецкіх уплываў і ёй цяжка будзе пазбыцца тае ашкі, калі-б яна гэтага захацела... Мэта маскоўская дасягнена. Прыйдзе потым час на далейшыя крокі, калі прабе гадзіна, што ў Маскве будзе выбіта мэдаль накшталт Кацярыны II з надпісам: «Отторженное возвратим» на памятку царскай спадчыны».

Так заліваюцца ад злосьці і завісьці падваротныя сабачкі і толькі таму, што знайшоўся на сьвеце сусед, які замест таго, каб быць падхалімам ангельскіх і іншых інтарэсаў і ўзалежніць сябе ад іх, дык ён самастойна, як роўны з роўным, заключыў з намі ўмову, якая нічым яму не пагражае і пакідае якой небудзь ад нас алежнасьці. Хіба што мы таксама будзем залежнымі?

5-га лістапада а 7-й гадзіне ўвечары ў

ДОМЕ КУЛЬТУРЫ (вул. Валадарскага)

адбудзецца прысьвечанае 10 гадавіне Кастрычнікавай Рэвалюцыі

ўрачыстае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК і СНК БССР

разам з Менскім Гарадзкім Саветам і ўдзелам партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый, рабочых, сялян і часьцей Чырвонай арміі, з наступным парадкам дня:

1. Аб значэньні Кастрычнікавай Рэвалюцыі для БССР.
Дакл. тав. КНОРЫН.

2. Прыняцьце адозвы і пастаноў ЦВК і СНК БССР у сувязі з 10-цігодзьдзем Кастрычнікавае рэвалюцыі.
Дакл. тав. ГАЛАДЗЕД.

На пасяджэньне запрашаюцца члены і кандыдаты Прэзыдыуму ЦВК БССР, члены і кандыдаты ЦВК БССР, члены і кандыдаты ЦВК СССР, якія знаходзяцца ў Менску, члены і кандыдаты ЦК і ЦКК КП(б)Б, члены і кандыдаты ЦСПСБ, народныя камісары, іх намесьнікі і члены калегій народных камісарыятаў, члены і кандыдаты ЦК ЛКСМБ, члены і кандыдаты акружкому КП(б)Б, АКК КП(б)Б і акружкому ЛКСМБ, члены і кандыдаты Менакрвыканкому і Гарадзкага Савету, камандзіры і камісары карпусоў, дывізій, палкоў і начпадывы. Памянёныя асобы прыходзяць на пасяджэньне па сваіх мандатах.

Рабочыя, сяляне і чырвонаармейцы прыходзяць на пасяджэньне па запрашальных білетах, якія рассылаюцца па завкомах, мясцкомах і часьцях Чырвонае арміі.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ

1—3

Генэральная праверка сіл французкай кампартыі.

ПАРЫЖ, 2-XI. У „Юманіце" аталошан маніфэст французкае кампартыі наконт надыходзячых увосеню будучага году парлямацкіх выбараў. Адзначаючы фальш „дэмакратычнага ладу", маніфэст заяўляе, што выбарчая кампанія павінна палкам згуртаваць навакол асноўных лёзунгаў партыі, а ўласна: абарона СССР і кітайскае рэвалюцыі; барацьба проці французкага калёніяльнага імпэрыялізму ў Марока і Сірыі; барацьба проці падатковае палітыкі ўраду Пуанкарэ-Эрыё; захаваньне „8-мігадзіннага дню; адпор капіталістычным мэтадам рацыяналізацыі; барацьба проці дарагоўлі і проці кватэрнага крызісу; падтрыманьне салдат, маракоў і рэзэрвістаў; уезагульная амністыя.

Далей маніфэст заяўляе, што партыя пастанавіла выставіць сваіх кандыдатаў ва ўсіх 612-ці выбарчых акругах. З тае прычыны, што гэта патрабуе выдаткаў на суму каля 3 міліёнаў франкаў. ЦК партыі распачынае падпісну для збору неабходных сродкаў, „лічачы, што перадвыбарчая агітацыя павінна ўзьняць шырокія масы працоўных гораду і вёскі для таго, каб даць на палітычнай арэне адпор тым угарам, якія кіруючыя колы наносяць кампартыі і ўнутранай кампэдэрацыі працы".

Пад націскам рабочых мас.

ГАМБУРСКІЯ МЕНШАВІКІ ГАЛАСАВАЛІ ЗА КАНДЫДАТУРУ КАМУНІСТА Ў ВІЦЭ СТАРШЫНІ МАГІСТРАТУ.

БЭРЛІН, 2-XI. Зьяўляючыся другою па колькасьці фракцыяю гамбурскага муніцыпалітэту, камф

АПОШНІЯ ВЕСТКІ.

(Атрыманы а 1-ай гадзіне ўночы).

АДСРОЧКА БЮДЖЭТНАЕ СЭСІІ ПОЛЬСКАГА СОЙМУ.

ВАРШАВА, 3-XI. На сёньнешні дзень было назначана першае пасяджэньне бюджэтнай сэсіі польскага сойму, але перад адчыненьнем пасяджэньня віцэ-прэм'ер Бартэль абвясьціў дэкрэт прэзыдэнта аб адсрочцы сэсіі на 30 дзён. З прычыны таго, што паўнамоцтвы сойму сучаснага складу канчаюцца яшчэ да гэтага 30-цідзённага тэрміну, дык адсрочка фактычна зьяўляецца роспускам сойму.

РАБОЧЫЯ МІТЫНГІ Ў ПОЛЬШЧЫ.

ВАРШАВА, 3-XI. Па ўсёй Польшчы на фабрыках і заводах адбываюцца лятучыя мітынгі, прысьвечаныя 10-цігодзьдзю Кастрычнікавае рэвалюцыі. У рабочых раёнах на сьценах будынкаў зьяўляюцца надпісы ўшанаваньня Кастрычніка. У Лодзі адбыўся канцэрт і мітынг, у якім прымала ўдзел 800 рабочых. Затым частка прысутных накіравалася к турме, дэманструючы ў гонар палітычных вязьняў.

АДСТУПЛЕНЬНЕ УХАНСКАГА ВОЙСКА.

ШАНХАЙ, 3-XI. Уханскае воска адступае, панкінцы бяз бою займаюць эвакуаваныя мясцовасьці. Аванґард панкінскіх войск перайшоў граніцу правінцыі Хубэй.

Па паведамленьню японскага агенцтва, становішча ў Ханькоу напружанае. Чужаземцы баяцца масавых выступленьняў. Сярод гамінданаўцаў расьце нездавальненьне Тан-Шэн-Чы. Уханскі гаміндан узбройвае рабочых. Гэта выклікае нездаволеньне чужаземцаў, якія апасаюцца «аднаўленьня камуністычнай чынпасьці.

*

ШАНХАЙ, 3-XI. Дзеля аховы францускай канцэсіі ў Ханькоу прыбыў атрад францускага войска ў 200 чалавек.

Немцы аб польскай авіяцыі.

Нямецкая месячная часопісь, прысьвечаная справам авіяцыі—„Ді Люфтвахт" дае сэрыю артыкулаў аб становішчы авіяцыі ў розных дзяржавах. У №№ 8 і 9 разглядаецца становішча авіяцыі ў Польшчы. Артыкул мае пэўную цікавасьць і дзеля нас, грамадзян Савецкае Беларусі, бо закранае тэму, якая нас вельмі блізка абходзіць.

Пры ўтварэньні польскае дзяржавы—гаворыць аўтар артыкулу—яна ня мела амаль ніякіх паветраных сілаў. У яе распараджэньні знайходзілася толькі некалькі старых апаратаў. У падобным жа становішчы знаходзілася і другая новаўтвораная дзяржава—Чэхаславакія.

Але ў той час, як у Чэхаславакіі пачаўся хуткі рост авіяцыі, у Польшчы наглядаўся застой, і за адзін год праны Чэхаславакія дасягнула лепшых вынікаў, чым Польшча за ўвесь час свайго існаваньня аж па сягоднішні дзень.

У 1919-1920 гадох, калі адбывалася вайна з саветамі, шмат дапамагла стварэньню польскае авіяцыі Францыя, але, атрымоўваючы ад свае саюзьніцы старыя апараты самых розных сыстэмаў, Польшча ў вае нный гарачцы пэўна-ж не магла стварыць моцнае авіяцыі. Толькі ў 1925 годзе была праведзена рэарганізацыя польскае авіяцыі, і наложаны трывалыя падваліны пад яе далейшае плянавае разьвіцьцё. Ваеннаветраныя сілы Польшчы ў сучаснасьці выглядаюць так:

Польская ваенная авіяцыя мае 18 разьведачных эскадраў—агулам 162 самалёты, 10 паляўнічых эскадраў—95 самалётаў і 2 бамбамётныя эскадры—18 самалётаў. Пры такой лічбе самалётаў польская ваенная авіяцыя не зьяўляецца павагаю наступальнаю сілаю, здольнаю да самастойных паветраных апэрацыяў наступальнага характару. Яна можа адыгрываць толькі дапаможную ролю ў адносінах да апэрацыяў арміі і флёту. Разьведачныя польскія самалёты наогул добрае канструкцыі, добра ўзброены і маюць дзеля арміі вартасьць, якую нельга недаацэньваць. Паляўнічыя самалёты—аднамяйсцовыя і могуць толькі абараняць разьведачныя апараты, альбо не дапушчаць варожых налётаў. Бамбамётныя апаратаў занадта мала. Дзьве эскадры іх—гэта толькі завязь будучае наступальнае сілы, але разбудаваньне яе справа ня блізкае будучыні.

Аб падгатаванасьці лётнага і тэхнічнага пэрсаналу судзіць цяжка, але ў кожным разе падгатоўцы лётчыкаў Польшча аддае шмат увагі.

Паветраныя грамадзянскія зносіны пачало ў Польшчы францускае таварыства, якое носіць цяпер назву „Сідна" (С. І. Д. N. A, — „Compagnie Internationale de Navigation Aerienne"). У 1921 г. таварыства гэтае прадоўжыла сваю лётную лінію Парыж—Прага да Варшавы. У наступных гадох паветраныя зносіны ў Польшчы разьвіліся досыць шырока, дзякуючы дагодным геаграфічным умовам і слабасьці чыгуначнае сеткі. Агульная даўжыня дзейных лініяў паветраных зносін у Польшчы дасягае 2.500 кілёмэтраў. Экспляатацыя іх знаходзіцца ў руках памянёнага францускага таварыства і двох польскіх („Аэролёт" і „Аэро").

Лётная прамысловасьць у Польшчы, не зважаючы на ўсе стараньні, яшчэ не дасягла да самастойнага і незалежнага ад заграніцы становішча. Праўда абсталяваньне налічных фабрык дазваляе выраблянць 75 самалётаў у месяц, але фактычная вытворчасьць ня можа дасягнуць гэтае лічбы дзеля адсутнасьці збыту, бо адзіным пакупцом апаратаў зьяўляецца ўрад. Фабрыкі дзеля гэтага працуюць з няпоўнаю нагрузкаю і даюць дэфіцыт, які пакрываецца ўрадам. Фабрыкі знаходзяцца ў пэўнай залежнасьці ад заграніцы, бо будуюць самалёты не свае, але загранічнае канструкцыі.

Можна сумляваца, ці ўласная творчая прана зможа справіцца з задачамі ў кароткім часе. Судзячы з дасюлетняга ходу разьвіцьця польскае лётнае прамысловасьці, абставіны гэтага разьвіцьця ня хутка зьменяцца. Нельга гаварыць аб добрых пэрспэктывах лётнае тэхнікі ў Польшчы, пакуль тэхнічныя працы і практыкаваньні распыляюцца сярод лётных саюзаў і пасобных аматараў, а не канцэнтруюцца ў адным добра абстаўленым прадпрыёмстве.

У міравым часе польская лётная прамысловасьць можа справіцца са сваімі задачамі, бо можа папаўняць свае недахваты з заграніцы. Але калі б Польшча аказалася пакінутаю толькі на свае ўласныя сілы, трэба было-б чакаць паважных цяжкасьцяў у працы ўсяго апарату лётнае прамысловасьці.

З гэтага вынікае, што польская авіяцыя не адыгрывае паважнае ролі ні як збройная сіла, ні як сродак міжнародных паветраных зносін, ні як галіна прамысловасьці. Затое заслугоўваюць увагі дасягнутыя вынікі ўнутрыдзяржаўных паветраных зносін і жывы ўдзел у разьвіцьці авіяцыі шырокіх масаў насельнасьці.

Да гэтых увагаў нямецкае часопісі мы з свайго боку мусім дадаць некалькі ўвагаў. Нямецкая часопісь мае некаторае права наглядаць зьверху на польскую авіяцыю і авіяцыйную прамысловасьць, бо заўсягды мае перад сабою параўнаньне іх са становішчам авіяцыі і авіяцыйнае прамысловасьці Нямеччыны. Што значаць 275 ваенных самалётаў Польшчы проціў 14.000 самалётаў, якія Нямеччына пры заканчэньні вайны мусіла выдаць саюзьнікам, альбо будаваньне пры найвялікшай напружанасьці 75 самалётаў у месяц з чужымі рухавікамі проціў здольнасьці Нямеччыны давасьці ў разе патрэбы самалётную вытворчасьць да двох тысяч з лішкам у месяц і са сваімі рухавікамі? Адсутнасьць вырабу ў Польшчы рухавікоў — вось Ахілесава пята польскае лётнае прамысловасьці, але ў бліжэйшай будучыні Польшча закладвае сваю фабрыку рухавікоў, і гэты недахват будзе выраўнены. Што належыцца да адсутнасьці ўласных досьледаў, дык 4 верасьня ў Варшаве адчынены аэрадынамічны інстытут, і гэты недахват ужо выраўнівацца. Таксама пашыраецца дзейнасьць ужо раней існаваўшага інстытуту тэхнічных досьледаў авіяцыі.

Наогул-жа, погляд на польскую авіяцыю з Заходу і ад нас з Усходу ня можа быць аднакавым. Мы ня маем права лёгкадумна адносіцца ні да польскае авіяцыі, нівагул да польскае ваеннае падрыхтоўкі. Мы павінны прыглядацца да іх і рабіць свае контр-заходы.

Вышэйпераказаны артыкул нямецкага месячніка цікавы дзеля нас толькі тым, што ён сьведчыць аб нявысокім становішчы польскае авіяцыі пры вераньні яе разьвіцьця эўранейскаю меркаю. А гэта значыць, што рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу могуць (не аслабляючы, вэрэшта, свае ўвагі да таго, што дасягнута за нашаю заходняю граніцаю) спакойна займацца творчым будаўніцтвам новага жыцьця.

Як калёніяльныя сатрапы абараняюцца ад уплыву камуністаў.

АМСТЭРДАМ, 22-X. На прыплыўшы ў Сэрабажа (усходняя Ява) нямецкі пароход «Фрэйбург» зьявілася паліцыя і заявіла, што водлуг атрыманых генэральным пракурорам вестак, доктар судна зьяўляецца членам нямецкае кампартыі. Доктару было забаронена выходзіць на бераг. Забарона была матывавана нежаданьнем улады дапусьціць які-небудзь кантакт між доктарам і інданэзкімі камуністамі.

З Сэрабажу пароход «Фрэйбург» вышаў у Паданг (на заходнім беразе Сумаўтры). У Паданзе па згодзе таго-ж пракурора ледзь зьвярнулі а каюты доктара вартаваў паліцэйскі.

У Саюзе ССР.

Чырвоная армія за 10 гадоў.

ЛЕНІНГРАД, 2-XI. Увечары 2-га лістапада адчынілася першая з сэрыі юбілейных выставак Ленінграду—выстаўка Чырвонае арміі і Флёту. У 15-ці залях разьмешчаны аддзелы авіяцыі, бранявое справы, вайскова-санітарны, кавалерыйскі, артылерыйскі, марскі. Экспанаты падабраны з такім разьлікам, каб паказаць эвалюцыю вайсковае справы ў Чырвонай арміі з 1917 году да нашых дзён.

Асыгнаваньні на кватэрнае будаўніцтва.

МАСКВА, 2-XI. Асыгнаваньні Усекабанку на кватэрнае і камунальнае будаўніцтва ў 1927-28 г. г. павялічваюцца на 50 міліёнаў руб. Усяго на кватэрнае будаўніцтва Усекабанк выдае ў 1927-28 г. г. 206 міліёнаў.

Задача выканана.

МАСКВА. На пасяджэньні дзіючае камісіі ЎсеЦВК выявілася, што задача, каб да 10-е гадавіны кастрычніка ў Маскве не заставалася бяспрытульных, выканана на 90-95 проц. У дзіцячыя ўстановы ў Маскве ў сучасны момант ужо прынята больш 2000 бяспрытульных. Цяпер на вуліцах Масквы засталіся толькі адзінкавыя бяспрытульныя.

Залежы вугалю на Сахаліне.

ЛЕНІНГРАД, 29-X. У Ленінград вярнулася сахалінская экспэдыцыя геолёгічнага камітэту пад кіраўніцтвам геолёга Крышталовіча. Крышталовіч паведаміў, што на поўдзень ад рудзічнага пасёлку на заходнім беразе выспы вынайдзена вялікая плошча вугалю. Узятыя для выпрабаваньня ўзоры вугалю паказалі дасканалую яго якасьць. Вугаль дае высока тунковы мэталюргічны кокс. Яго запасы ў рудзічным раёне вызначаюцца ў некалькі міліёнаў пудоў.

Японскія канцэсыянэры Дуйскіх капальняў вельмі хвалілі якасьць вугалю рудзічнага раёну. Водлуг слоў японскіх геолёгаў, сахалінскі вугаль на сваёй якасьці лепшы за гатункі кардыфскага вугалю.

Т-ва „Тэхніка масам".

МАСКВА, 1-XI. У Маскве арганізавана ўсесаюзнае дабрахвотнае таварыства пад назваю „Тэхніка масам". Задача таварыства дапамагаць распаўсюджваньню тэхнічных ведаў сярод рабочых і сялян. Заснавана камісія для распрацоўкі статуту таварыства. У камісію ўваходзяць прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі, прадстаўнікі рабочых ад прадпрыёмстваў і пэраг асоб прыглядаецца пэрсанальна. Сярод апошніх—т. т. Крупская, Касіёр, Сьвярдлоў і інш.

На 10-ты Кастрычнік у Чырвоную краіну.

2-я ДЭЛЕГАЦЫЯ АЎСТРЫЙСКІХ РАБОЧЫХ ЗА СПАЧУВАНЬНЕ КАМПАРТЫІ.

ВЕНА, 2-XI. У сераду выехала ў Маскву аўстрыйская рабочая дэлегацыя для ўдзелу ў сьвяткаваньні 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі. Дэлегацыя складаецца з 15 чалавек, частка якіх займае службовыя пасады ў сацыял-дэмакратычнай партыі.

Разам з гэтай дэлегацыяй выехала дэлегацыя рабочае моладзі.

ДЭЛЕГАЦЫЯ З ТУРЦЫІ.

БЭРЛІН, 3-XI. Сёньня ў Бэрліне прыехала па дарозе ў Маскву турэцкая кастрычнікавая дэлегацыя, у склад якое, у ліку іншых, уваходзяць генэральны сэкратар народнае партыі, рэдактар афіцыёзу «Хакіміет Міліе» і рэктар канстантынопальскага унівэрсытэту. На вакзале дэлегацыю спатыкалі прадстаўнікі савецкага і турэцкага пасольстваў. Пазьней дэлегацыя была прынята паслом СССР тав. Краськінскім.

ДЭЛЕГАЦЫЯ ПЭРСІДЗКІХ ГРАМАДЗКІХ ДЗЕЯЧОЎ.

БАКУ, 2-XI. У склад пэрсідзкае дэлегацыі, якая едзе ў Маскву на кастрычнікавыя сьвяты, уваходзіць 7 чалавек. Старшыня дэлегацыі—п. Сулейман Мірза, ранейшы міністр асьветы Пэрсіі, іншыя дэлегаты—буйныя грамадзкія дзеячы, журналісты, дэпутаты мэджыліса, прадстаўнікі пэрсідзкага купецтва.

Сёньня ўночы пэрсідзкая дэлегацыя прыехала ў Маскву.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ ЭСПЭРАНТЫСТАЎ.

МАСКВА. На запросіны ўсесаюзнае асацыяцыі прыяцеляў міжнароднае мовы ў Маскву на Кастрычнікавую гадавіну прыязджае інтэрнацыянальная дэлегацыя рэвалюцыйных эспэрантыстаў. Пакуль-што ў Маскву прыехалі тры прадстаўнікі рэвалюцыйных эспэрантыстаў: з Лейпцыгу (Нямеччына) дырэктар-адміністратар міжнароднае асацыяцыі рэвалюцыйных эспэрантыстаў (САТ) тав. Лерхнэр і прадстаўнік Лейпцыгскае групы рэвалюцыйных эспэрантыстаў тав. Гемпэль і з гораду Нім(Францыя) камуніст тав. Салян.

ЛЕНІНГРАД. Прыехала другая амэрыканская экскурсія ў складзе 21 чалавека. Экскурсія будзе прысутнічаць на кастрычнікавых сьвятах у Маскве.

На кастрычнікавыя сьвяты ў Ленінград прыехала дэлегацыя міжнароднага таварыства эспэрантыстаў.

У панскай Польшчы.

ГАЛАДОЎКА ПАЛІТВЯЗЬНЯЎ У ЛОДЗІ.

ВАРШАВА, 2-XI. У лодзінскім астрозе 300 палітычных зьняволеных абвясьцілі галадоўку.

Бясчынства польскіх улад.

ВАРШАВА. Польская пагранічная ўлада ў Стоўпцах кафіскавала сьцяг, які везьлі дэлегаты нямецкага саюзу чырвоных франтавікоў у Маскву.

АРЫШТЫ Ў КЕЛЬЦАХ.

28 кастрычніка г. г. па загаду з Варшавы арыштаваны ўсе вышэйшыя ўрадоўцы Кельцкай гарадзкой рады. Арыштаваны яны з прычыны надрукаваньня на радавых машынках лятучкі аб ген. Загурскім.

СТАНОВІШЧА ДЛЯ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ НЕ ЗЬМЯНІЛАСЯ.

ВАРШАВА. Каля цытадэлі адбылася дэманстрацыя ля магілы накараных царызмам рэвалюцыянэраў, арганізаваная саюзам ранейшых паліткатаржан. У ліку прамоўцаў выступалі радыкальны журналіст Длугашэўскі, які падкрэсьліваў, што польская рабочая кляса застаецца прыгнечанаю таксама ў вызваленай ад царскае ўлады Польшчы. Прамоўца зазначыў, што ў Польшчы рабочых судзяць цяпер па тымжа царскім кодэксе, на падставе якога былі засуджаны да пакараньня сьмерцьцю і пахаваныя тут дэманстранты.

Зьезд кансэрватараў.

У Львове адбыўся зьезд 250 асоб—абшарнікаў кансэрватараў, якія, як кажа манархічнае віленскае «Слово» пастанавілі, што „цяпер падышоў час зьліквідаваць нерадваенную нацыяналістычную ідэялёгію і яе мейсца павінна заняць дзяржаўна-творчыя ўгрупаваньні".

Украінскія манархісты.

У Львове адбылося сабраньне манархічнай канстытуцыйнай арганізацыі, якая ўхваліла шэраг рэзалюцый, якія сьцьвярджаюць, між іншым, прызнэ стасунак манархічных украінскіх арганізацыяў да ўраду Пілсудзкага.

Затануў польскі пароход.

БЭРЛІН, 2-XI. Агенцтва Вольфа паведамляе: „У Данцыгскай бухце абярнуўся польскі марскі буксір «Горнік». Падасьпеўшаму на выратаваньне польскаму буксіру „Рыбак" нікога з 10 чалавек экіпажу выратаваць не ўдалося".

Да усіх працоўных Менску і Менскай акругі.

Адозва і пастановы, ухваленыя на аб'яднаным пасяджэньні Менскага Акр. Вык. Кам. і Гарсавету 29-X па дакладу Старшыні СНК тав. Галадзеда аб гаспадарчых дасягненьнях да 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі.

Таварышы

Мінае 10 гадоў ад таго часу, як пралетарыят нашае краіны ў саюзе з сялянствам пад кіраўніцтвам Ленінскае партыі бальшавікоў перамаглі капіталістаў і башарнікаў, адняўшы ў іх фабрыкі, заводы, зямлю. Упяршыню ў гісторыі чалавецтва дыктатура экспляататараў зьмянілася дыктатурай пралетарыяту, заснаванай на шчыльным саюзе рабочае клясы з сялянствам.

10 гадоў таму назад на руінах старога, наскрозь прагніўшага царскага ладу, узьнік новы дзяржаўны лад, узьнікла першая ў сьвеце Рабоча-Сялянская Дзяржава; дзяржава, якая вызваліла працоўных, якая абвясьціла роўнапраўнасьць усіх нацый і народаў, паставіўшая сваёю мэтаю будаўніцтва сацыялізму і барацьбу за вызваленьне эксплёатаемых і прыгнечаных усяго сьвету.

Але ўзьнікшая Савецкая Дзяржава выклікала шалёную нянавісьць банкіраў, фабрыкантаў і абшарнікаў усіх краін.

Пачалася суровая барацьба проці Савецкае краіны, падрываючай сваім існаваньнем асновы капіталістычнага ладу.

Войска імпэрыялістаў Англіі, Нямеччыны, Францыі, Амэрыкі, Чэхаславакіі, Польшчы, Румыніі супольна з прахадзімцамі з ранейшых царскіх генэралаў, барона, графоў—Калчаком, Юдэнічам, Красновым, Урангелем, Булак-Балаховічам і інш. абкружылі з усіх бакоў Савецкую Рэспубліку.

Але магутным напорам рабочых і сялян гэты фронт быў перарваны.

Белагвардзейскія масы не змаглі ўтрымацца пад націскам Арміі Рэвалюцыі, Чырвонае арміі і былі ёю разьбіты.

У гэтай крывавай бойцы між працай і капіталам на долю рабочых і сялян Менскае акругі, як і працоўных усёй БССР, выпалі цяжкія часы.

Менская акруга, якая знаходзілася на рубяжы капіталістычнага сьвету, увесь час была арэнай барацьбы.

Тэрыторыя акругі некалькі разоў пераходзіла ў рукі ворагаў рабочых і сялян.

Ня мінула і 2-х месяцаў ад дня агалашэньня ўлады Саветаў, як БССР была акупавана войскам нямецкага кайзэра.

Улада Саветаў зьмянілася ўладаю бранірованага кулака нямецкіх юнкераў. Рэвалюцыйны парадак зьмяніўся бязладзьдзем акупацыйнае ўлады. Рэшткі зруйнаванае гадамі гаспадаркі распягваліся і раскрадваліся нямецкім імпэрыялізмам.

Але нядоўга цягнулася гэтае панаваньне нямецкае ваеншчыны. Барацьба рабочых і сялян проці акупантаў, выбухнуўшая рэвалюцыя ў Нямеччыне вярнула рабочым і сялянам волю: 1-га студзеня 1919 г. была агалошана самастойная Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусі.

Не пасьпелі працоўныя Беларусі залячыць раны, учыненыя нямецкім імпэрыялізмам, як пачалася новая вайна. Вясною 1919 г. армія польскіх панаў, падтрыманая міжнароднымі імпэрыялістамі, распачала наступ на Савецкую Беларусь.

Пачалася новая акупацыя, якая напамінала горшыя часы рэакцыі.

Нячуваныя гвалты і зьдзекі над працоўнымі зрабілісь штодзённым зьявішчам. Панскі біэун гуляў ваўсю.

І толькі ў 1920 г. пераможная Чырвоная армія палажыла канец панаваньню абшарнікаў і фабрыкантаў.

Далейшай барацьбой працоўных былі зьнішчаны рэшткі шматлікіх банд, якія пасылаліся капіталістамі і абшарнікамі на тэрыторыю Савецкіх Рэспублік.

Перамогшы ў грамадзянскай вайне, пралетарыят ісьляніства ўзяліся за аднаўленьне зруйнаванае гаспадаркі.

Гаспадарка Менскае акругі і гор. Менску, як цэнтру БССР, была асабліва моцна зруйнавана за гады вайны.

Ня гледзячы на гэта, сіламі рабочых і сялян пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, гаспадарка акругі і ўсяе Савецкае краіны да 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі адноўлена і разьвіваецца па сацыялістычнаму шляху.

Прамысловасьць акругі пашырылася і абагацілася шэрагам новых буйных прадпрыёмстваў.

Сельская гаспадарка пераходзіць на новыя паляпшаныя формы землякарыстаньня. З кожным годам колькасьць празналосных гаспадарак зьмяншаецца. Адсталыя сыстэмы паляводзтва (трохпалёўка) уступаюць месца больш удасканаленым (шматпольле). Расьце жывёлаводзтва. Інтэнсыфікацыя сельскае гаспадаркі ідзе шпаркім крокам наперад. Эканамічна ўмацоўваюцца бядняцкія гаспадаркі. Усё больш і больш разьвіваецца каапэраваньне сялянскіх гаспадарак на вёсцы, з году ў год растуць і ўмацоўваюцца сацыялістычныя элементы гаспадаркі.

Сацыяльна-культурнае абслугоўваньне шырокіх працоўных мас далёка перавышае ўсё тое, што ў гэтай галіне рабілася да рэвалюцыі. Павялічваецца з году ў год лік школ, больніц, амбуляторый і г. д.

Забясьпечана абслугоўваньне насельніцтва на яго роднай мове.

Побач з правядзеньнем беларусізацыі дзяржаўнага апарату і ростам беларускіх культурных устаноў праводзіцца абслугоўваньне нацыянальных меншасьцяў на іх роднай мове: арганізаваны нацыянальныя школы, сельсаветы, суды і г. д.

Побач з культурным і гаспадарчым ростам акругі расьце і дабрабыт рабоча-сялянскіх мас. Расьце заработак рабочых, паляпшаецца матар'яльнае становішча бядняцка-серадняцкае масы сялянства.

Гэткія вялізныя посьпехі ў нашым савецкім, гаспадарчым і культурным будаўніцтве былі магчымы толькі дзякуючы таму, што ў гэтае будаўніцтва былі ўцягнуты шырокія масы рабочых і сялян.

Адзначаючы нашы дасягненьні ў справе сацыялістычнага будаўніцтва за мінулыя гады, Акруговы Выканаўчы Камітэт і Менскі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў заклікае ўсіх рабочых і сялян, усіх працоўных акругі да ўзмоцненае працы па далейшаму разьвіцьцю нашае народнае гаспадаркі.

Побач з гэтым рабочыя і сяляне акругі, якія знаходзяцца на рубяжы капіталістычнага сьвету, павінны памятаць аб навісшай пагрозе ўзброенага нападу імпэрыялістычных драпежнікаў на Савецкі Саюз. Таму, уздымаючы гаспадарку, неабходна ўсямерна ўмацоўваць абароназдольнасьць нашае краіны.

Асаблівую ўвагу Чырвонай арміі і васнізацыі працоўных.

Акруговы Выканаўчы Камітэт і Гарадзкі Савет выказваюць цьвёрдую непарушную ўпэўненасьць у тым, што дружная упартай працай усіх працоўных пад ленінскім кіраўніцтвам камуністычнай партыі бальшавікоў, пры братэрскім падтрыманьні рэвалюцыйнага міжнароднага пралетарыяту, надзеі якога накіраваны на СССР, як на цытадэль пралетарскай рэвалюцыі, мы пераможам усе цяжкасьці, якія стаяць на шляху нашага сацыялістычнага будаўніцтва, на шляху канчатковай перамогі працы над капіталам!

Адзначаючы з пачуцьцём глыбокага здавальненьня маніфэст ЦВК СССР да 10 гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, які зьяўляецца адным з буйнейшых дасягненьняў працоўных Савецкага Саюзу і які мае вялікае міжнароднае значэньне, Акруговы Выканаўчы Камітэт і Гарадзкі Савет даручаюць прэзыдыумам на падставе маніфэсту распрацаваць мерапрыёмствы па далейшаму паляпшаньню становішча рабочых і сялян.

У прыватнасьці распачынаючы ажыцьцяўленьне маніфэсту ЦВК і ў адзнаку 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі, Акруговы Выканаўчы Камітэт і Гарадзкі Савет пастанаўляюць:

Па г. Менску

1. Распачаць у 1928 г. пабудову гарадзкога трамваю.

2. У наступным будаўнічым сэзоне распачаць пабудову дому для рабочых на 70 кватэр.

3. Зрабіць у бягучым годзе ня менш 1000 бясплатных электрычных уводаў у кватэры рабочых і ўзмацніць асьвятленьне ваколіц гораду, паставіўшы на ваколіцах ня менш 100 ліхтароў.

4. Для ўзмацненьня дапамогі беспрацоўным пашырыць існуючыя працкалектывы на 400 чалавек у працягу бліжэйшых 2-х тыдняў і дадаткова на 500 чал. у працягу 1927-28 г.

Пры чым для скарачэньня жаночага беспрацоўя да 50 проц. паказанага ліку павінна быць прынята беспрацоўных жанчын.

5. У сёлетнім гаспадарчым годзе пабудаваць інтэрнат для беспрацоўных.

6. Для ўзмацненьня дапамогі бяспрытульным дзецям адчыніць у дзень 10-цігодзьдзя сталоўку для бяспрытульных дзяцей.

7. 6-га і 7-га кастрычніка зрабіць урачыстае адчыненьне:

а) хлебазаводу, назваўшы яго імем «10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі»;

б) сухотнага інстытуту;

в) амбуляторыю на Ляхаўцы.

Зрабіць закладку:

а) будынку Унівэрсытэту;

б) малочнага заводу;

в) дому для рабочых на 70 кватэр.

Па гор. Барысаву

8. Адчыніць: а) новую міжрайённую больніцу, назваўшы яе імем «10-цігодзьдзя Кастрычніка»; б) Нова-Барысаўскую цэнтральную рабочую амбуляторыю, в) начны санаторы і г) зрабіць закладку будынку сямігодкі ў Нова-Барысаве.

Па райёнах акругі

9. Маніфэст саюзнага ўраду аслабяне бядняцкія гаспадаркі ад аплаты землябудаўнічых прац. Каб яшчэ больш палегчыць землябудаўніцтва беднаты—стварыць акруговы фонд дапамогі гаспадарчага набыцьця земляўпарадкаваемых бядняцкіх гаспадарак.

10. У мэтах дапамогі далейшаму ўзьняцьцю сялянскіх гаспадарак шляхам іх інтэнсыфікацыі, у прыватнасьці разьвіцьця жывёлагадоўлі, у працягу 1927-28 г. скончыць пабудову халадзільніка і пабудаваць цэнтральны малочны завод у Менску.

11. Скончыць у бягучым 1927-28 г. асушку балот плошчай 11.000 гэкт. у Сьмілавіцкім і Пухавіцкім раёнах.

12. Для забесьпячэньня магчымасьці дзецям беднаты нармальнага наведваньня школ — стварыць спэцыяльны фонд дапамогі дзецям беднаты.

13. Скончыць да 11 гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі пабудову Дому Селяніна ў Менску.

14. Урачыста адчыніць пабудаваныя да 10-годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі:

а) электрастанцыі у Чэрвені, Узьдзе, Бярэзіне і электраасьвятленьне ў в. Лошыца, Самахвалавіцкага раёну;

б) крахмальны завод у Алесіне, Смалявічах;

в) Суцінскі і Варанежска-Слабодзкі асуш. канавы Пухавіцкага і Сьмілавіцкага раёнаў.

г) вэтлячэбніцы ў Койданаве і Заслаўлі;

д) дзіцячыя кансультацыі ў Бярэзіне, Сьмілавічах і Лагойску;

е) дзіцячую калёнію ў Сёмкава-Заслаўскім раёне.

Старшыня Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту і Гарадзкога Савету **Яцкевіч.**

Сэкратар Акруговага Выканкому **Жуковіч.**

„Аншлюс" і замежная палітыка Нямеччыны.

У сярэдзіне гэтага месяцу адведаюць Вену сам старшыня нямецкага ўраду—рэйхсканцлер Маркс і міністр замежных спраў Нямеччыны Штрэзэман. Ледзьве толькі гэтая вестка напала на старонкі газэт, адразу-жа пачаліся разважаньні на тэму: якую канкрэтную мэту могуць мець гэтыя адведзіны. Самае першае слова, якое прыходзіць у галаву пры ўсякай вестцы аб нямецка-аўстрыйскіх зносінах—гэта „Аншлюс" (далучэньне). Гэтае кароткае нямецкае слаўцо здабыло сабе настолькі шырокую вядомасьць і настолькі часта ўжываецца на старонках эўранейскага друку, што звычайна падаецца ў газэтах без перакладу, і францускі ці італьянскі чытач сам ужо ведае, аб чым ідзе справа. Справа „Аншлюсу" ніяк не лічоную колькасьць разоў абгаворвалася на старонках сусьветнага друку і яшчэ на рад гадоў застанецца адным з найважнейшых пытаньняў эўранейскае міжнароднае палітыкі.

Рэшткі даваеннае Аўстрыі, адрэзаныя Сэн-Жэрмэнскім мірным трактатам ад мора і пастаўленыя ў цяжкія эканамічныя ўмовы, захавалі сваю незалежнасьць насупроць волі сваіх жыхароў і ўсім правом лёгкі і справядлівасьці. Сучасная аўстрыйская рэспубліка мае чыста-нямецкую насельнасьць, і самым натуральным разьвязаньнем аўстрыйскае праблемы зьявілася бы далучэньне Аўстрыі да Нямеччыны. Ясна, што рэспубліка, якая захавала толькі дзесятую (альбо дзевятую) частку насельнасьці былое аўстравэнгэрскае манархіі, але 35 проц. яе прамысловасьці і блізка двохміліённую сталіцу, будучы адрэзана ад мора і ранейшых рынкаў збыту, зьяўляецца творам штучным і раней ці пазьней мусіць скончыць сваё бясслаўнае існаваньне. Але такога разьвязаньня справы баяцца нацыяналісты Францыі, Італіі, Чэхаславакіі, Югаславіі. Урады гэтых дзяржаў пільна сачаць за разьвіцьцём „аншлюсавага" руху ў Нямеччыне і Аўстрыі і ўвесь час робяць адпаведны націск на нямецкі і аўстрыйскі ўрады. Францыя баіцца, што аб'яднаньне Аўстрыі і Нямеччыны занадта ўзмацніць апошнюю і павялічыць ваенную пагрозу францускім границам з Усходу. Чэхаславакія баіцца быць зацісьнутаю з трох бакоў у нямецкія абцугі, а Італія і Югаславія ня хочуць мець сваёю беспасярэднюю суседкаю магутную Нямеччыну замест слабое Аўстрыі. Пры такіх абставінах, асабліва, калі ўспамянуць пра такі „аргумэнт" у руках францускага ўраду, як налічыньсьць на абшары Нямеччыны добра арганізаванае і ўзброенае францускае арміі,—правядзеньне „Аншлюсу" адным махам зьяўляецца абсалютна немагчымым

Але яшчэ ў часе вайны немцы паказалі, што яны вялікія майстры на часьці розных „эрзацаў"—сурагатаў. Гэтую здольнасьць яны выявілі таксама і ў справе забароненага ім «Аншлюсу». На яго мейсца зьявіўся „эрзац"—ужо даволі папулярнае ў нямецкім друку і пакуль што мала вядомае ў не-нямецкіх газэтах „Англяйхунг" (выраўнываньне). Самы „Аншлюс" застанецца канчатковаю мэтаю будучыны, а страваю штодзённага ўжытку яго „эрзац". Якое „выраўнываньне" разумеецца?

Тэрмінам „выраўнываньня" называецца знадворку самастойная і асобная, а ў глыбі скаардынаваная праца абодых урадаў—Нямеччыны і Аўстрыі, скіраваная да выраўнываньня, да зьвяшчэньня ўсіх розьніц у адміністрацыйным, эканамічным юрыдычным, культурным і сацыяльна-бытавым ладам тае і другое краіны. У канчатковым выніку ўсё павінна быць адпаведным як у Аўстрыі, так і ў Нямеччыне: аднакавая адміністрацыйная сыстэма, аднакавая пабудова судоваг і школьнага апаратаў, аднакавыя законы і г. д. Гэты працэс наступовага зьбліжэньня і зьяднаньня Нямеччыны і Аўстрыі з кожным годам робіць усё поўнэй і поўнэй посьпехі. Ужо дзеля пераезду з адной дзяржавы ў другую ня трэба ніякіх візаў.

Ужо грамадзяне адной дзяржавы пры атрыманьні работы ў другой дзяржаве маюць аднакавыя правы з яе тубыльцамі. Ужо дзеці грамадзян адной дзяржавы пры пераезьдзе з бацькамі ў другую дзяржаву падлягаюць школьнаму прымусу наравне з мясцовымі дзецьмі, а іх бацькі гэкім-жа карам у выпадку непасыланьня іх у школу, як і бацькі мясцовых дзяцей. Ужо значна зьбліжаны мытныя тарыфы і значна аблегчаны гандлёвы зварот паміж Нямеччынай і Аўстрыяй пры супольным фронце проціў тавараў іншага паходжэньня. Гэты сьпіс посьпехаў „выраўнываньня" можна было бы дапаўняць яшчэ і яшчэ іншымі фактамі, але звычайна, нямецкія газэты аб іх мала пішуць, напэўна каб не дразьніць без карысьці працаўнікаў „Аншлюсу". Гэтым летам, аднак, адбыўся настолькі значны крок наперад у палітыцы „выраўнываньня", што справа мела шырокі міжнародны водгук.

У Нямеччыне і ў Аўстрыі апрацаваны новы крымінальны кодэкс, аднакавы (ці блізка зусім аднакавы) дзеля Нямеччыны і Аўстрыі. Адначасна з гэтым праводзіцца поўнае ўпадабленьне ўсяе судовае справы.

Вярней усяго, што гэта і зьяўляецца найбліжэйшаю прычынаю візыту барлінскіх гасьцей у Вэне, пры чым у часе я

ДА ДЗЕСЯТАЙ ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА.

З ЧЫМ ПАВІННЫ ПАМЯТАЦЬ СЯЛЯНЕ, СЬВЯТКУЮЧЫ 10-ю ГАДАВІНУ КАСТРЫЧНІКА.

У вагні рэвалюцыі народжаны Кастрычнік зьнішчыў абшарнікаў і фабрыкантаў, аддаўшы фабрыкі рабочым, з якіх яны працуюць і кіруюць без фабрыкантаў, а зямлю—батракам, безземельным і малазямельным сялянам, і супольна з савецкай уладай, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, будуюць пановаму сваю сельскую гаспадарку.

Наглядзім, што зроблена ў ёй за 10 гадоў існаваньня савецкай улады.

Атрымаўшы ў спадчыну ад старога царскага ўраду зусім зруйнаваную вайной сельскую гаспадарку з трохполкай і цераспалосіцай, са старымі дапаўскімі мэтадамі апрацоўкі зямлі, і ўрад пастанавіў самым карэнным чынам перарабіць яе на больш вышэйшых эканамічных пачатках. Для гэтага ён узмоцненым тэмпам пачаў праводзіць землеўпарадкаваньне, пасьля чаго зьявілася шматпольле з шырокімі палосамі, з павялічэньнем засеву больш выгадных культур.

Дзеля гэтага ўрад стварыў сельскагаспадарчую крэдытную каапэрацыю, яна мае вялікае значэньне ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі; зьявіліся трактарныя плугі, пружынныя і дышлавыя бароны, малацілка, веялка і інш. машыны. У калектыўных гаспадарках зьявіўся сталёвы конь-трактар. Для зьнішчэньня малазямельля асушаюцца балоты, якіх шмат у нашай Беларусі.

Для бяднейшага сялянства праводзіцца дармовае землеўпарадкаваньне, даюцца ільготы па сельска-гаспадарчаму падатку і страхаваньні, утвораны ў кожным раёне пункты для ачысткі збожжа і інш.

Для абслугоўваньня насяленьня мэдыцынскай дапамогай у кожным раёне адчынены больніцы, мэдыцынскія і ветэрынарныя пункты.

На зьмену прыватнаму гандляру, які наживаўся за кошт спажыўца, прышла каапэрацыя, гаспадаром якой зьяўляецца сам селянін.

Дзякуючы ўсім гэтым мерапрыёмствам, праведзеным нашым урадам для паляпшэньня сельскай гаспадаркі, і тым сродкам, якія ён штогод укладае на ўзьняцьце яе, гаспадарка наша далёка перавысіла даваенны ўзровень. Аднак, дасягнутых вынікаў яшчэ мала для таго, каб сельская гаспадарка зрабілася зусім культурнай і даходнай, і ўраду цяжка справіцца з гэтай задачай без актыўнага ўдзелу шырокіх сялянскіх мас. Неабходна, каб само сялянства ў гэтым пытаньні выявіла большую ініцыятыву, каб яно не чакала, што за яго нехта зробіць.

Толькі агульнымі дружнымі сіламі, супольна з савецкай уладай, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мы ўзьнімем нашу сельскую гаспадарку на належную вышыню.

Вылучэнцы-сяляне (Г. КОЗЫРАЎ.
члены ЦВК Бел. (С. ТАФЕЕНКА.

Эканамічнае становішча рабочай моладзі Менскай акругі.

Эканамічная работа была цэнтральным пунктам ва ўсёй працы камсамолу. Чарговымі задачамі камсамолу за апошні перыяд былі: 1) узмацненьне ўдзелу ў гаспадарчай рабоце; 2) паглыбленьне працы ў прафсаюзах; 3) паляпшэньне пастаноўкі ахоны бяспэкі на прадпрыёмствах; 4) запаўненьне брані з 5) барацьба з бесправоўем. Калі мы ў першыя гады новай эканамічнай палітыкі—1921-22 г.г. мелі нязначную колькасьць моладзі ў вытворчасьці, дык у гэтым момант у нас яна складае значную колькасьць рабочых і штогод расьце. У 1925 годзе мы мелі па Менску 25.596 чалавек прафсаюзаў, з іх моладзі 4.957 чалавек, ці 16,35 проц., падлеткаў—642 чал. 2,5 проц.

У 1927 годзе мы ўжо маем на 35.744 чалавек прафсаюзаў па Менску моладзі—6.93 чал., ці 19.9 проц., падлеткаў—1.05 чал., ці 3,62 проц.

На 10-ці індустрыяльных заводах мы маем бязмоўны рост рабочай моладзі. У 1925 годзе на 12.212 чал.,—моладзі—2832 чал.

Сама паслана на працу рабочай моладзі, з мінулых гады, кажа, што ідзе рост рабочай моладзі ў вытворчасьці. Калі за 1926 год паслана на броні, звыш брані і дыпкалектывы—315 чал., то за 9 месяцаў 1927 году паслана 371 чал.

Галіне кваліфікацыі і адукацыі мы маем тры прафшколы, 4 фабзавучы, дзве брыгад, 8 вячэрніх школ, шэраг курсаў.

Трэба канстатаваць, што зусім ужо няпісьменных сярод рабочай моладзі, яшчэ толькі невялічкая група малапісьменных. Яны займаюцца зараз у лікпунктах. Яшчэ новае пакаленьне культурных працаўнікоў. Аб гэтым сьведчыць узмацніўшаяся цяга рабочай моладзі да вучобы, прыйшоў у рабфакі, ВНУ, тэхнікумы і інш. У нас зараз 1015 чал. беспрацоўнай моладзі. Частка з іх будзе паслана ў якасьці брані на работу. Арганізаваны два прадпрыемствы на 100 чал. Да кастрычнікавага свята будзе паслана на працу яшчэ 150 падлеткаў.

Рабочая моладзь зразумела задачы сацыялістычнай будоўлі і рацыяналізацыі. Асобныя выпадкі непаразуменьня гэтых задач можна яшчэ дзе нідзе назіраць: напр., можна яшчэ спаткаць такія „разговорчики", што ў выніку рацыяналізацыі, шмат моладзі будзе выкінута з вытворчасьці ня будзе вучобы, броні, паменшыцца заробная плата. Аднак асноўная частка моладзі зразумела значэньне рацыяналізацыі. Усюды падымалася дысцыпліна, паменшыліся спазьненьні, прагулы. Пытаньні рацыяналізацыі вытворчасьці прапрацоўваюцца на ўсіх канфэрэнцыях моладзі.

Процант моладзі, якая працуе ў вытворчых камісіях, падняўся з 4 проц. у мінулым годзе, да 6,3 проц. у гэтым.

За апошні год на Менску разбраніравана—50 чал., па акрузе—114 чал.

З агульным ростам заробчай платы рабочых—расьце і заробная плата рабочай моладзі.

У 1913 годзе вучань—мэталіст пры паступленьні атрымоўваў—4 р. 80 к., у 1923 г.—11 руб., а ў 1927 годзе ён ужо атрымоўвае 20 руб. Вучні шкляных заводаў у 1913 годзе атрымоўвалі пры паступленьні 4—6 руб., у 1927 г.—30 руб. Вучні абойнай фабрыкі ў 1913 г. атрымоўвалі—10 р., цяпер—20 руб. (лічбы зарплаты даюцца ў таварных руб.).

Гутаркі ад адмене брані былі выкліканы перагледам яе норм у сувязі з разьвіцьцём прамысловасьці. Было-б дрэнна, каб бронь не пераглядалася. Ранейшыя нормы броні прывялі-б нашу прамысловасьць к кепскаму становішчу. Калі мы заставім ранейшыя нормы броні, то ў цэлым шэрагу галін прамысловасьці будзе тармазіцца ўдасканаленьне вытворчасьці. Акрамя гэтага, мы ў шэрагу галін прамысловасьці рыхтавалі-б кваліфікаваную рабочую сілу для біржы працы. Нормы броні ў далейшым будуць вызначацца згодна запатрабаваньням нашай прамысловасьці, згодна запатрабаваньням рацыяналізацыі. Прычым бронь ужо працуючая ні ў якім разе ня будзе скарочана.

Эканамічныя заваёвы рабочай моладзі дасьць значныя. Камсамол, які стаіць на варце гэтых заваёў, будзе і надалей сачыць за тым, каб новыя пакаленьні давалі культурных, здаровых і сьвядомых пралетарыяў.

Р. Г—н.

Ад лютага да Кастрычніка.

(Хроніка ідэйных падзей).

22 кастрычніка (4 лістапада).

— У Петраградзе—„Дзень Петраградскага Савету"—дзень дэманстрацыі і падліку сіл, якія ідуць пад лёзунгамі саюзу і збору сродкаў у „Жалезны фонд"—Савету.

— Керанскі, даведаўшыся аб рассылцы В.-Р. К-там у часьці гарнізону тэлефонаграмы аб непадчыненьні загадам штабу вакруга вокругу бяз санкцыі В.-Р. К-ту, адмяніў загад нач-ку штабу вокругу Багратуні адмяніць Савету ўльтыматыўнае трэбаваньне аб адмене тэлефанаграмы;—у іншым выпадку вайсковымі ўладамі будуць прыняты энэргічныя меры для аднаўленьня законнага парадку.

— Крэйсэр „Аврора", які павінен быў выйсьці з Петраграду на пробу машын пасьля рамонту, атрымаў загад застацца. Камандзе было паведамлена, што крэйсэру „Аврора" прыдзецца прымаць самы актыўны ўдзел у падтрыманьні Савету ў часе перавароту.

— У Маскве адчынілася абласная канфэрэнцыя вайсковых арганізацый с.-д. (бальш.), скліканая Ваенным бюро пры Маскоўскім К-це (б-коў). З дакладаў з месц высьветлілася, што гарнізон вобласьці падта варожа адносіцца да Керанскага да часу ураду, што настрой салдат баявы.

Фінансы Беларускай Савецкай Сац. Рэспублікі.

Аднэй з асноўных задач правільнай арганізацыі фінансавай гаспадаркі, пастаўленай ужо ў першыя гады савецкай улады ў Беларусі было побудавань не цьвёрдага бюджэту.

У дзяржаўным бюджэце 1922-23 г. непадатковыя прыбыткі займалі ўсяго 15,5 проц., а ў бюджэце—1926-27 г. яны складаюць ужо больш 60 проц. агульнай сумы прыбыткаў. Маючы на ўвазе, што крыніцай непадатковых прыбыткаў бюджэту зьяўляецца дзяржаўная гаспадарка, зробіцца зусім зразумелым, што мы ў кароткі параўнаўча час дасягнулі вельмі значных посьпехаў у справе належнага выкарыстаньня дзярж маемасьці рэспублікі.

Выдатковая частка бюджэтаў таксама падлягала вельмі значным зьменам.

Як вядома, наш бюджэт зьяўляецца асноўным пераразьмеркавацелем сродкаў, якія атрымліваюцца ад насельніцтва і дзяржаўнай гаспадаркі. Таму пры ацэнцы вынікаў нашай працы ў галіне выдаткаваньня дзяржаўных сродкаў трэба грунтавацца на галоўных асаблівасьцях гаспадаркі і культуры БССР.

Вось гэтыя асаблівасьці: пераважная роля ў эканоміцы рэспублікі сельскай і лясной гаспадаркі, яскрава вызначаная аграрная перанасяленасьць з выцякаючым з яе бесправоўем, слабае разьвіцьцё прамысловасьці, агульнакультурны ў мінулым заняпад, як спадак старога ладу, распаўсюджваньне хваробаў.

Якімі-ж дасягненьнямі характарызуецца фінансавая палітыка Беларусі за мінулы час. Ці знайшлі ў ёй адбітак усе зазначаныя вышэй асаблівасьці народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

Для адказаў на гэта пытаньне пададзём некалькі лічбаў:

	У тысячах руб.		
	1923-24 г.	1926-27 г.	1926-27 г. у пр. да 1923-24 г.
Прамысловасьць і электрыфікацыя	—	5.505	—
Сельская і лясная гаспадарка	1.166	10.739	921,0
Камунальная гаспадарка	1.213	2.886	237,9
Народная асьвета	4.682	18.153	387,7
Ахова здароўя	1.734	6.372	367,4

Пададзеныя лічбы настолькі яскравы, што не патрабуюць асаблівых тлумачэньняў.

Дасягненьні, паказаныя ў табліцы, зрабіліся магчымымі як з прычыны агульнага ўзросту бюджэту за зазначаныя гады, так і з прычыны зробленага пераразьмеркаваньня сродкаў унутры самых бюджэтаў.

У гэтых адносінах найбольш цікавыя лічбы, якія паказваюць зьмену ўдзельнай вагі выдаткаў на адміністратыўныя і адміністратыўна-гаспадарчыя патрэбы. Займаючы ў бюджэтах 1923-24 г. 46,8 проц., паказаныя выдаткі зьніжаюцца па бюджэту 1926-27 г. да 21,5 проц.

Адсюль мы бачым, што пры пабудове бюджэту цьвёрда захована дырэктыва камуністычнае партыі і ўраду ў максымальнай эканоміі выдаткаў на дзяржаўны апарат у мэтах накіраваньня вызваленых сродкаў на гаспадарчае ўзмацненьне і культурнае разьвіцьцё краіны.

Колькасна бюджэты БССР за мінулы час выявілі бурны рост. Вось некалькі лічбаў. Дзяржаўны бюджэт 1923-24 г. складаў каля 10 міл. руб., бюджэт на 1926-27 г. (бяз Гомельшчыны) перавысіў 46 міл. руб.

Мясцовы бюджэт у 1923-24 г. выявіўся сумай у 10,8 міл. руб., па 1926-27 г. ён складаў ужо каля 35 міл. руб. (па БССР у межах 1926 г.). Тут, між іншым, трэба адзначыць поруч са значным ростам абодвых бюджэтаў больш моцнае, у параўнаньні з мясцовым, узрастаньне дзяржаўнага бюджэту. Гэта зазначае на необходнасьць зьвярнуць асаблівую ўвагу на вывучэньне становішча мясцовых бюджэтаў БССР, у прыватнасьці, на становішча мясцовых крыніц прыбыткаў.

Што тычыцца пытаньня аб мясцовым бюджэце, дык нельга не адзначыць факту ўзмацненьня фінансавай самастойнасьці і магутнасьці райёну, як нізавой савецкай адзінкі.

Упяршыню райённыя бюджэты былі ўведзены ў БССР у 1924-25 г., займаючы ў агульнай суме мясцовага бюджэту гэтага году 34,8 пр.

Праз два гады, г. зн. па бюджэту 1926-27 г., удзельная вага райённых бюджэтаў узьмацнецца да 46,4 пр. Гэта навочна сьведчыць аб выключнай увазе пры складаньні бюджэту да пытаньняў найбольш поўнага здаволеньня непасрэдных мясцовых патрэбаў.

Дзеля далейшай дыферэнцыі мясцовых бюджэтаў і ўзмацненьня фінансавай магутнасьці неакруговых гарадоў, мястэчак і сельсаветаў, са складу райённых бюджэтаў выдзелены ў 1926-27 годзе самастойныя бюджэты 25 неакруговых гарадоў, 12 мястэчак і 13 сельсаветаў.

Гэтыя мерапрыёмствы бясспрэчна павінны дапамагаць як далейшаму ўзмацненьню мясцовага бюджэту, так і найлепшаму абслугоўваньню мясцовых патрэбаў.

Гэткія галоўныя вынікі, фінансавай, працы ў галіне дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў.

Поруч з бюджэтам, заслугоўвае быць адзначанай праца фінорганаў па прыцягненьню ў дзяржаўныя логвы зьберажэньняў насяленьня як у выглядзе пазыкі, так і праз касы ашчаднасьці.

Ашчадная справа мае ў БССР значныя дасягненьні. Так, за час з 1-X 1924 г. да 1-X—26 г. лік укладчыкаў павялічыўся больш, чым у 3 разы, сума ўкладаў павялічылася амаль у 10 разоў. Такі тэмп узросту перавышае той, які меў месца ў дарэвалюцыйнай Расеі, дзе, як вядома, разьвіцьцё ашчаднай справы было вельмі значным.

Што датычыцца пытаньня аб пазыках, то трэба адзначыць, што кампанія, якая цяпер адбываецца па рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі, ужо шырока разгарнулася, і па папярэдніх даных да 20 кастрычніка падпіска склала звыш 1 мілн. руб.

Заканчваючы кароткі агляд фінансаў БССР да 10 гадавіны Кастрычніка, трэба сказаць, што мы маем ужо бясспрэчныя і буйныя посьпехі.

Задачай далейшага зьяўляецца ўсебаковае ўзмацненьне ўвагі фінансавым пытаньням з боку ня толькі непасрэдна праводзячых гэту працу фінансавых органаў, але і іншых дзяржаўных органаў, а таксама і ўсёй савецкай грамадзкасьці. Трэба ўзмацніць працу па адшуканьню і ўзмацненьню прыбытковых крыніц, а таксама па простаму мэтазгоднаму выкарыстаньню ўсіх бюджэтных рэсурсаў.

Поруч з гэтым необходна ўжыць усе захады да таго, каб кожная вольная капейка не ляжала пад спудам, а была мэтазгодна выкарыстана на патрэбы нашай народнай гаспадаркі праз пазыкі і касы ашчаднасьці.

Мікуліч.

10-годзьдзе Кастрычніка ў Менску.

4-5 лістапада.

Агітпрацэсіі па рабочых райёнах гораду, якія абвесьцяць рабочаму насельніцтву аб наступленьні сьвята.

Да ўдзелу ў агітпрацэсіі прыцягваюцца камсамольцы, піанэры старэйшага ўзросту і чырвонаармейцы.

5-га лістапада.

А 4-й гадзіне—лятучыя мітынгі на прадпрыёмствах.

А 7-й гадзіне вечара ў Доме Культуры—урачыстае пасяджэньне ЦВК, СНК, Гарсавету, Акрвыканкому, ЦК і ЦКК, АК і АКК, ЦК і АК ЛКСМБ, прэзыдыуму ЦСПСБ і ЦП саюзаў з запрашэньнем дэлегацый ад прадпрыёмстваў, сялян і нацменшасьцяй.

6-га лістапада.

Дзень адчыненьня і закладкі прадпрыёмстваў.

Прыбіўка мэмарыяльных дошчак на 1-м доме Гарсавету і на месцы пасяджэньня 1-га рэвкому 1917 г.

7-га лістапада.

У 11 гадзін на пляцу Парыскай Камуны адбудзецца парад вайсковых часьцей Менскага гарнізону.

А 12 гадзіне дню на Пл. Волі дэманстрацыя.

Дзіцячыя рапішнікі ў клюбах і дзенныя кіно-сэансы для дзяцей у кіно-тэатрах.

Пасьля дэманстрацыі—кіно-сэансы для сялян с-с. гарадзкой мяжы ў кіно „Культура".

З 2-х гадзін дню бясплатныя кіно-сэансы для членаў саюзаў і чырвонаармейцаў у кіно-тэатрах „Культура", „Чырвоная Зорка", „Пралетары" і „Інтэрнацыянал".

А 8-й гадзіне ўнечары пастаноўка ў Беларускім дзяржтэатры.

8-га лістапада.

Дэманстрацыя дзяцей і дзень змычкі.

Перадкастрычнікавыя дні ў Магілеве.

У адным з папярэдніх нашых нарысаў з цыклю «1917 год на Магілеўшчыне» мы зьмясьцілі цэлы шэраг рэзалюцый воінскіх часьцей і іншых арганізацый, патрабаваўшых перавоза арыштаванага Карнілава і яго супольнікаў з гасьцініцы Метраполь у «больш паўнае памяшканьне, якім зьяўляецца губэрская турма» (дакладная вытрымка з пастановы выбарных ад Магілеўскага гарнізону).

Сьледчая камісія, на чале якой быў пракурор Шаблоўскі, між іншым, далікатна, але цьвёрда адхіліла дапамогу мясцовых дэмакратычных арганізацый у справе расьсьледаваньня карнілаўскай змовы і тады-ж (у канцы верасьня, па старому стылю) перавяла Карнілава, Дэнікіна, Лукомскага і інш. у г. Быхаў, дзе саноўныя вязьні і жылі-пажывалі аж да таго часу, пакуль уцяклі на Дон—да сярэдзіны лістапада 1917 г.

Мы зараз зьмяшчаем вытрымку з ліста афіцэра—прыхільніка Карнілава, пасланага з Магілеву хутка пасьля перавоза арыштаваных у Быхаў.

Гэты ліст выдае з галавой членаў надзвычайнай сьледчай камісіі.

„Калі,—піша афіцэр з стаўкі свайму прыяцелю,—Карнілаў знаходзіўся пад арыштам у гасьцініцы Метраполь, дык каля дзьвярэй дзень і ноч стаялі тэкінцы, узброеныя шаблямі, і падазрона аглядвалі кожнага ўваходзячага да генэрала, а потым напружана ўслухоўваліся—ці не пачуецца крык генэрала аб паратунку.

Нядаўна ўсіх арыштаваных перавялі ў Быхаў і зьмясьцілі ў радзейшай свіцкай калёгіі, а зараз яны ўсе пераведзены ў памяшканьне жаночай гімназіі.

Для пераводу арыштаваных прызначаліся спачатку два гарады: Рагачоў і Быхаў. У Быхаве, вядома, памяшканьне горшае, але затое надзейны гарнізон з польскай дывізіі; у Рагачове памяшканьне лепшае, але гарнізон з „таварышоў".

Выбар генэрала Карнілава спыніўся на Быхаве, і асобам, спачуваючым яму, удалося ажыцьцёвіць яго жаданьне.

Разам з вязьнямі, накіраваўся ў Быхаў і шчыра адданы генэралу тэкінскі полк, апроч аднаго эскадрону, які застаўся ў Магілеве.

Учора мы езьдзілі на аўтамабілі ў г. Быхаў наведаць вязьняў.

Для таго, каб іх наведаць, патрэбен быў дазвол камэнданта гораду, якім назначан адданы Карнілаву ўсёй душой палкоўнік тэкінскага палка Грыгор'еў.

Зразумела, дазвол быў зараз-жа выдадзен, і мы былі ў генэрала Карнілава і іншых».

Пасьля гэтага няма чаго дзівіцца, што ў ноч з 19 на 20 лістапада генэралы Карнілаў, Дэнікін, Эрдэлі, Лукомскі і інш. лёгка і без перашкоды ўцяклі на конях з Быхава ў Растоў.

ЧОРНАЯ НЯЎДЗЯЧНАСЬЦЬ.

Ці-ж ён, В. Чарноў, выступаўшы ў тыя дні ў Магілеве на ўсіх мітынгах, сходах і інш., не разьвіваў тэорыі вялікай асьцярожнасьці ў зямельным пытаньні?

Ці-ж ён ня выступаў за заўзята супроць захопу гвалтам абшарніцкае зямлі?

Ці-ж ён, Чарноў Віктар, як міністр, ня стрымліваў рупліваньці некаторых зямельных камітэтаў, якія скардзіліся на занадта павольнае вырашэньне зямельнага пытаньня і таму раілі перайсьці ад слоў да справы?

А, між тым,—паслухайце, як орган магілеўскіх земцаў (Магілеўскае Жыцьцё» ад 31 кастрычніка 1917 г.) лаіць, што называецца, Чарнова направа і налева, абвінавачвае яго ў шматлікіх грахох, вольных і нявольных:

„Другі камень у галаву ўраду Расейскай Рэспублікі запусьціў В. Чарноў.

Прыватнае землеўладаньне зьяўляецца тай мухай, якая сядзела на лбу маладога, толькі што ўступіўшага ў кіраўніцтва краінай ураду. Вялізны камень, у выглядзе ўзаконеньня зямельнага захопу, спрабавалі кінуць у права ўласнасьці на зямлю. Але прынцып уласнасьці незакравуты перамясьціўся на другое месца, а камень кінуты. В. Чарновым, раздрабіў усю гаспадарку—без разбору абшарніцкую, хутарскую,—якія дастаўлялі хлеб для армії і ўсяго насельніцтва краіны".

ДАСТАЛОСЯ І СКОБЕЛЕВУ.

Побач з Чарновым выступаў у тыя дні і міністр Скобелеў.

І вось, відаць, па прыказцы—«усім сёстрам па завушніцы», той-жа орган магілеўскіх земцаў «Магілеўскае Жыцьцё», адзіная ў Магілеве газэта, якая выходзіла ў перадкастрычнікавыя і пасьлякастрычнікавыя дні (орган левай групы Магілеўскага Савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў і орган Губсавету сялянскіх дэпутатаў «Молат» зачыніліся ў першыя дні кастрычніка), абрушылася з цэлым шэрагам абвінавачаньняў на сьціплага, умеранага Скобелева:

„Наш народ, дрэнна ці добра, але працуючы, стварыў дабрабыт, які высока ваціў увесь сьвет.

Прышоў Скобелеў міністр працы, паляваў на рукі, схаціў аглоблю і і давай крышыць направа і налева.

І няма ў нас нашай прамысловасьці, рушыліся асновы народнай працы.

Не зважаючы на цяжкія ўмовы таго моманту, выступаючы ад імя ўраду, ён пагражаў канфіскаваць замежны і расейскі капіталы.

У выніку — капіталы зьнікілі, і расейскі і чужаземны пашлі заграніцу,—і зьнікла дашчэнту тая крыніца якая жывіла нашу прамысловасьць».

«ДЗЯРЖАЎНЫЯ МЛАДЗЕНЦЫ».

„7-8 месяцаў працы новых будаўнікоў",—зло сьмяхаецца газэта а часовага ўраду, і ўсюды бязладзьдзе, усюды развал, і замест новага жыцьця, шчасьлівага і радаснага, нястрымна шырыцца на зямлі расейскай анархія і голад.

Увесь лад дзяржаўнага жыцьця—армія, народная праца, сельская і гарадзкая гаспадарка—усё рушылася ў агульным бязладзьдзі".

Гэты артыкул газэта прыстасавала якраз да часу злёту ў Магілеў партыйных лідэраў, да таго часу, калі ў Магілеве з хвіліны на хвіліну меўся быць складзеным новы ўрад на чале з Чарновым, у процівагу мяцежнаму Петраграду.

СТАРЫ ЖУРНАЛІСТ.

Дзяржаўнае страхаваньне.

Дзяржаўнае страхаваньне, ва ўсіх яго відах, зьяўляецца сродкам забесьпячэньня насельніцтва дапамогай на выпадак якога-небудзь няшчасьця (пажару, падзяжу жывёлы, градабіцьця і г. п.). Але разьвіцьцё дзяржаўнага страхаваньня знаходзіцца ў поўнай залежнасьці ад агульна-эканамічных умоў краіны. І па меры таго, як пашыраліся і ўзмацняліся сельская гаспадарка, прамысловасьць, таваразварот і інш., разам з гэтым пашыралася і дзяржаўнае страхаваньне. Так, напрыклад, у 1923-24 годзе страхавых плацяжоў па ўсіх відах і формах страхаваньня сабрана было па БССР 1662 тыс. руб., а за 1926-27 г., водгук папярэдніх даных, яны перавысілі чатыры мілёны рублёў. Штогодна павялічэньне агульнай сумы страхавых плацяжоў адбывалася ня гледзячы на тое, што Дзяржстрах сыстэматычна зьніжаў свае тарыфы, зрабіўшы іх значна меншымі ў параўнаньні з даваеннымі тарыфамі ня толькі акцыянэрных таварыстваў, але і земскіх.

Асяродкам працы дзяржаўнага страхаваньня па аб'ёму апэрацый зьяўляецца вёска. Сельскае страхаваньне ў 1926-27 годзе дало 68 проц. агульнай страхавой сумы застрахаванай маёмасьці і 73 проц. страхавых плацяжоў.

Асноўным відам працы дзяржаўнага страхаваньня на вёсцы зьяўляецца абавязковае акладное страхаваньне, якое па сваіх клясавых адзнаках ахоўвае маемасныя інтарэсы найменш забясьпечанай часткі насельніцтва. Апошняе карыстаецца страхаваньнем альбо зусім бясплатна, альбо са значнымі ільготамі. Гэтыя льготы з кожным годам ахапляюць усё больш лік бяднейшага насельніцтва. Напрыклад, у адносінах да налічанай страхоўкі ільготы складалі: у 1924-25 годзе—6,6 проц., у 1925-26 г.—11,8 проц., у 1926-27 г.—12,2 проц. і ў 1927-28г. (прыблізна)—15 проц.

Будынкі аднаго сельскага двара ў 1926-27 годзе па абавязковым акладным страхаваньні страхаваліся ў сярэднім у 189 руб., супроць 96 руб. па даваенным земскім страхаваньні. Апрача таго, дзяржаўнае страхаваньне ахапляе і гэткую маемасьць, якая да рэвалюцыі не страхавалася, напрыклад, рагатую жывёлу ад падзяжу (па 20 руб. за галаву), коняў (па 30 руб. за галаву) і засевы ад градабіцьця (ад 15 да 20 руб. за гэктар). У сучасны момант узьнята пытаньне аб увядзеньні страхаваньня засеваў ад надмочкі і вымярзаньня, пасьля чаго сялянская гаспадарка будзе больш усебакова забясьпечана ад няшчасных выпадкаў.

За чатыры гады, пачынаючы з 1923-24 і канчаючы 1926-27 годам, Дзяржстрах выплаціў насельніцтву БССР узнагароды за страты па акладных і дабрахвотных страхаваньнях 6665 тысяч рублёў, ці 75 проц. паступіўшых у дзяржаўную страхавую касу плацяжоў.

Ацэнка практычнага значэньня дзяржаўнага страхаваньня для сялянства найбольш яскрава выяўлена ў факце пашырэньня ўдзелу яго ў дабрахвотных формах страхаваньня. За 26-27 г. дабрахвотным парадкам было застрахавана: ад агню—103.557 гаспадарак, ад градабіцьця—21.172 гаспадаркі і жывёлы ад падзяжу—у 27.168 гаспадарках.

Апрача сялянскага, пашыраюцца і іншыя віды страхаваньня. У 1923-24 годзе збор прэміі па несялянскіх страхаваньнях складаў 480 тысяч руб., а ў 26-27 годзе—1092 тысячы руб. У прыватнасьці, паступова ахапляецца дзяржаўным страхаваньнем маемасьць розных гаспадарчых установаў, камунальная, фабрычная і г. д.

Поруч з вышэйпамянёнымі відамі і формамі страхаваньня Дзяржстрах вядзе апэрацыі па страхаваньні людзей на выпадак сьмерці, на дажыцьцё і ад няшчасных выпадкаў. Пачынаючы з 16 красавіка 1924 г. і да 1 кастрычніка 1927 г., Дзяржстрахам застрахавана па БССР на выпадак сьмерці і на дажыцьцё 7743 асобы на агульную суму 6.144.800 руб. Сабрана прэміі па гэтых страхаваньнях 201.052 руб. Выплачана па стратах 16 асобам 11950 руб.

Апрача таго, уведзена яшчэ так званае «гарантыйнае страхаваньне», па якім Дзяржстрах бярэ на сябе адказнасьць за страты ў розных гаспадарчых і гандлёвых прадпрыёмствах і ўстановах у выпадках растрат, крадзяжу, пралікаў і інш. грошай ці тавараў, у касах ці на складах, па віне служачага (касіра, прадаўца і інш.). З ліпеня 1925 г. да 1 кастрычніка 1927 г. па гарантыйным страхаваньні ў БССР было застрахавана 1906 служачых у 1388 прадпрыёмствах на суму 10.121 тысяч руб. Сабрана прэміі па гэтаму віду страхаваньня 74.553 руб. Выплачана па стратах 18.677 р.

З. Чарнушэвіч.

Па чатырох краінах.

Уражаньне і сапраўднасьць.

Рыга--Бэрлін.

Мы на верхнім вакзале в гуртком адстаўнікоў ад беларускае грамадзкасьці—вось-вось рушыць цягнік. Да Рыгаю паднімаецца промін ад ліхроў ды рэклям. Чуваць заціхаючы гукат гарадзкога жыцьця. Ідзе гутарка аб нашым далейшым падарожжы. Нітам адзін з нас заўважвае, што ня «невядомых» мужчын пільна прыглядваюцца да нашай размовы. Відаць па ўсім, што не пасажыры... Мы выходзім на другое месца—«невядомыя» праводзяць нас поглядам, але за мі ня ідуць. М. Зарэцкі нядбайна махае рукою—плываць.

Бязмоўна—рэч пусьцяковая. Падбных тыпаў мы бачылі ў гатолю, прыкмячалі на вуліцах. Гатэльныя з цікавасьцю распытвалі тых, хто да нас прыведваў—калі і што ім даводзілася гаварыцца...Вулічныя былі далікатнейшымі—ні разу ніводнага з нас ні і чым не запыталі. Добрасуседзька зышліся мы і з вакзальнымі:—калі надбліжаўся час адходу цягніку, і яны ёмка схаваліся з нашага ваччу. Праўды, навошта клапаніцца аб тых, хто зараз вось пакідае горад...

Сьвісток павяртае нашы погляды ў бок правадачоў. Мігаюцца капялюхі, фуражкі. Мігаюцца будынкі вакзалу, гатэль, дзе мы стаялі, доўгі чыгунны мост, Задзьвіньне... Усё блядней промін ліхтароў, радзей ліхтаровыя бляскі—і ўжо ў абдымс роўных стэпаў Латвіі.

Рыга асталася з-заду. І расстаньне з ёю ўздымае ў нас пачуцьцё вагонаў, здаравенны сымпатычны латыш. Мы ў яго распытваем аб часе прыезду на нямецкую граніцу, аддаём рас'ы і лажымся спаць адны ў чатырохмесным купэ. Ужо дванаццатая гадзіна, а нам паведамілі, што цягнік а шостай прыбывае ў Эйдкунен. Трэба будзе не праспаць, бо там павінна прайсьці самае няпрыемнае, што ёсьць у падарожжы за рубеж,—гэта мытныя і пашпартныя рэвізіі. І хоць пры нас жаднага багажу, але мы недаем, што без прагляду не абыйдземся... У адчуваньні яго лажымся спаць.

Але чамусьці сьпіцца неспакойліва. Думка, каб дачасна прачнуцца, а не сьпяшыць перад самым Эйдкуненам сьвідрус мозаг і прабіваецца скрозь сон. К раніцы яна робіцца пазойлівейшай і ўжо а палове шостай уздымае нас з пасьцелі. Мы глядзімо праз хвіранку ў вакно, за якім крулюе цёплая ясная пагода, а ня можам пазнаць, дзе мы. Шырокая раўніна ніў, з рэдкімі няжаўтымі палоскамі аўсу, не адмячае сабою мясцовасьці. Мажліва мы перад Коўнаю, а мажліва неўзабаве Эйдкунен. Вярней—калі ўстанеш, прыгатовішся і спакойліва странеш граніцу. Ды цікава прасачыць самы пераезд з Літвы ў Нямеччыну. Для мяне з М. Чаротам гэта, праўда, ня нова, а М. Зарэцкі едзе ўпяршыню. Я падбіваю яго хутчэй шавяліцца з адзеньнем, а ён праклінае прымус так рана паднімацца. Самы сон—хоць-бы яшчэ з гадзінку-другую паспаць. Відаць, што хлопцу з-за гэтага нічога ня міла... Ды што-ж парадзіць—трэба ўставаць. І вось, калі мы ўжо з гадзінку паглядзелі ў вакно, толькі ўсяго пад'ехалі да Коўны. Трэба выявіць сабе—колькі гэта выклікала ў нас нароку і лаянак і на саміх сябе і на тую жанчыну з Reisebüro, якая прадавала нам білеты! Тут ужо мы ўбок адкінулі яе нам услугу—пакінуць для нас адных купэ—і ўсыпалі фэфэру як мае быць. Каб ды яна чула!..

Тунэль, перад Коўнаю, у які мы шмыганулі, як у чорную сопуху, адвёў нашы думкі на іншае. Мы ўяжджалі ў сталіцу другое дзяржавы—Літвы. Трэба хоць вокам кінуць на вядомы з школьнае лаўкі горад. Якавы яго выгляд, асабліва пасьля цэлага шэрагу ўрадавых пераваротаў? Што пасьнела зрабіць у сэнсе эканамічнага паляпшэньня стану літоўскіх рабочых і сялян фашысцкае правіцельства Вальдэмараса-Смэтоны? Ці ёсьць малюткая адзнака гэтага хоць-бы на прывакзальным выглядзе сталіцы? Ці толькі і асталося ў актыве іх урадаваньня шэраг ахвяр—растрэляных камуністых?

Цягнік спыняецца на пустым вакзале. Па плятформе прабягае некалькі чалавек вакзальных служачых. Зьяўляецца адкуль-сьці абадраны газэтчык. З цягніку вылазіць ня болей дзесяці пасажыраў; яшчэ менш садзіцца.

Маленькі мізэрны будынак вакзалу ўсё ў тэй-жа фарбе, у якой я бачыў яго ў 1925 годзе. На вакзале—пуста, за вакзалам—ціха. Так, як прыяжджаеш у які-кольвечы захалусны губэрскі гарадок. Перад Рыгаю Коўна—і пестэла... Міхасі выбягаюць з вагону і, сабраўшы рэшткі латыскае валюты, адведваюць літоўскага піва. Купляем разам некалькі расейскіх белагвардзейскіх часопісяў і газэт і хутка, так-жа ціха, як пад'ехалі, ад'яжджаем. З мосту праз Нёман, які доўгі час праводзіў нас і перад Коўнаю, кідаем погляды на горад. Ловім невялічкі заводзік, быўшы Тыльмансам, жоўты будынак вастрогу, дзесятак касьцёльных баштаў—гэтых бэстаў многалікага літоўскага рэакцыйнага ксяндзоўства, брудную ўзьбярэжную Нёмна, з пракладзенымі для паравіка рэйкамі, і прыгожыя, усаджаныя лістовым дрэвам, гарыстыя ваколіцы...

Усё, як кінографская істужка прабягае ў ва

Партыйнае жыцьцё

Пленум ЦКК КПБ.

Учора а 5 гадзіне ўвечары адчыніўся чарговы пленум ЦКК КПБ.

Пленум разьбярэ наступныя пытаньні: выкананьне пляну працы ЦКК—НК РСІ мінулага году і плян працы на 1927-28 год., аб працы ЦКК—РСІ ў галіне рацыяналізацыі прамысловага і гандлёва-каапэрацыйнага апарату, зьніжэньне адм.-гасп. выдаткаў і аб бліжэйшых задачах у гэтай галіне, даклад аб працы парткалегіі ЦКК і аб працы акруговай парткалегіі Бел. В. Акругі.

Партканфэрэнцыя Беларускай дывізіі.

Заўчора скончыла сваю працу 18 партыйная канфэрэнцыя Беларускай дывізіі.

Асноўныя пытаньні былі наступныя: даклад Палітычнай Управы і партыйнае камісіі Беларускага Васыпнага Акругу, даклад аб унутрыпартыйным становішчы УсесКП, даклад палітаддзелу дывізіі і дывізійнай партыйнай камісіі.

— Напярэдадні найвыдатнейшага юбілею СССР—10 гадавіны Кастрычніка і XV партыйнага зьезду, які павінен палажыць канец раскольніцкай дзеяльнасьці нязначнай кучкі апазіцыянэраў, партыйная арганізацыя Беларускай Вайсковай Акругі цьвёрда ідзе па шляху ленінізму, вядзе за сабою ўсю масу пралетарскіх байцоў акругі—гаворыць Начальнік Палітычнай Управы акругі тав Ланда.

— Палітычны ўзровень сучаснага чырвона і зацікаўленасьць бягучым жыцьцём партыі і дзяржавы так вырасьлі, што кожны палітработнік павінен вельмі шчыра працаваць над сабою, каб задавальняць палітычныя і культурныя запатрабаваньні чырвонаармейца. Побач з вайсковым статутам і зброяй—газэта і кніжка—вось заўсягдашныя падарожнікі нашага чырв-ца. Да разьвіцьця і запатрабаваньня яго падтасоўваецца і праграма палітычнага выхаваньня—кажа далей т. Ланда.

Ня гледзячы на кароткі тэрмін збораў, пераменны склад тэрытарыяльных часьцей акругі на сёлетніх манэўрах выявіў зусім здавальняючую балявую падрыхтаванасьць. На іх можна пакладацца ў баю так, як і на кадравыя часьці.

Галоўнае, што кожнаму кідаецца ў вочы, гэта поўная сьвядомасьць і адчуваньне адказнасьці за вялікую і цяжкую справу чырвонага ваякі, што дасягнута правільнаю і ўпартаю работаю каманднага і палітычнага складу і партыйнай арганізацыі. У гэтым заклад нашай перамогі

Спробы апазіцыі пранікнуцца ў рады нашай арганізацыі ня мелі посьпеху. Група апазіцыянэраў у 15 чалавек у шматтысячнай партыйнай арганізацыі акругі не выклікае ніякай небясьпекі. Большавіцкая загартаванасьць і выхаваньне нашага партыйца куды вышэй, чымся надаелая ўжо ўсім бязглуздасьць гэтай кроплі апазіцыянэраў—дакладвае сакратар акруговай партканісіі т. Балычэнка.

Вось заля чагосьці затаптала, заварушыліся ўсе. Погляд кожнага накіраваўся на сцэну. З глыбіні куліс паказалася сьвежая асоба ў вайсковай вопратцы з чатырма ромбамі.

— Слова мае для прывітаньня і інфармацыі аб унутрыпартыйным становішчы ГЕНЭРАЛЬНЫ СЭКРАТАР ЦК КПБ і ЧЛЕН РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ВАЙСКОВАГА САВЕТУ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ АКРУГІ ТАВАРЫШ КНОРЫН—апавяшчае старшыня.

Дружны грукат вопл. скаў ускалыхнуў залю.

Доўгія воплескі, шчырыя паслала парт-арганізацыя 2 Беларускай і 7 Самарскай дывізіяў кіраўніку кампартыі Беларусі, старраму загартаванаму бальшавіку т. Кнорыну.

Шырокая хваля воплескаў праводзіць тав. Кнорына з трыбуны. Гэтая хваля некалькі разоў то супакойвалася, то зноў пераходзіла ў пейкае бушуючае мора.

Так сустакалі вайсковыя камуністы вядомага барацьбіта за вызваленьне працоўных т. Кнорына.

— Недахватак памяшканьня для чырвонаармейцаў, дрэнныя кватэрныя ўмовы начскладу значна адчуваліся на баявой вучобе дывізіі. Баявая гатоўнасьць дывізіі, яе палітычны ўзровень за мінулы год зрабілі значныя крокі наперад. Асноўнае дасягненьне ў рабоце палітычнага аддзелу, гэта поўны ўдзел партыйнай арганізацыі ў справе вайсковай падрыхтоўкі чырвонаармейца. Партыйная арганізацыя дывізіі зусім стойкая. Аб гэтым сьведчыць хоць-бы і тое, што ў дывізіі быў толькі адзін апазіцыянэр, які некалькі дзён назад канчаткова здаўся і адмовіўся ад прыхільнасьці да апазіцыі—дакладвае былы начальнік Палітаддзелу дывізіі т. Супрун.

Сёньняшнія недахопы: ня зусім поўная яшчэ дысцыплінаванасьць дывізіі і некаторыя антымаральныя зьявішчы як выпіўкі, напрыклад.

Трэба адзначыць асаблівую актыўнасьць удзельнікаў канфэрэнцыі. Так, па дакладу Палітаддзелу выказалася ў спрэчках 33 ч., а запісалася больш 40, з іх трэцяя частка радавых чырвонаармейцаў і малодшага камскладу.

Галоўнымі момантамі высоўваліся наступныя: з большаю цьвёрдасьцю працягваць справу баявой падрыхтоўкі і палітвыхаваньня чыр-ца, шэрачай праводзіць беларусізацыю дывізіі, згодна трохгадовага плану, паленьшыць кватэрныя ўмовы начскладу, больш выхаваўчай работы ў дысцыплінарнай практыцы.

Вялікая актыўнасьць партыйца сьведчыць аб надзвычайным узросьце партарганізацыі за мінулы год і прыбліжэньні яе да баявой падрыхтоўкі дывізіі, што адзначана і ў прынятых рэзалюцыях.

Пасьля выбараў дывізійнае партыйнае камісіі і делегатаў на акруговую вайсковую партканфэрэнцыю работа канфэрэнцыі скончылася.

М—к.

Пад знакам ленінскага адзінства.

(Да вынікаў гарадзкой райпарткапфэрэнцыі).

На працягу 3-х дзён (з 29-X па 1-XI г. г.) праходзіла дзелавая праца 10-й гарадзкой райпарткапфэрэнцыі.

Канфэрэнцыя пасіла актыўны характар, аб чым сьведчаць масавыя выступленьні ўдзельнікаў канфэрэнцыі па ўсіх пытаньнях.

Па дакладу акругкому партыі запісалася 48 чал., з іх выказалася 21 чал., а па дакладу райкому партыі запісалася 51 чал., а выказалася каля 30.

У спрэчках дэлегаты перш за ўсё адзначылі правільны рост арганізацыі, дасягненьні ў падняцьці прамысловасьці райёну і г. д. Таксама гаварылі і аб недахопах, як: недастатачны ўдзел з боку адміністрацыі прадпрыёмстваў у паляпшэньні іх рацыяналізацыі, слабая праца вытворчых нарад у сэнсе абхапленьня імі і прыцягненьня да іх працы саміх рабочых; спрэчкі высьветлілі, што гэтыя нарады наведваюць 30-33 проц. членаў нарады; потым гаварылі аб узмацненьні строгага кантролю над буйнай прамысловасьцю, аб паляпшэньні якаснай працы грамадзкіх і масавых арганізацый і г. д.

Канфэрэнцыя шмат атрымала ад рабочых падарункаў, заслухала 5 прывітаньняў ад рабочых арганізацый розных прадпрыёмстваў.

Прадстаўнікі рабочых, якія рабілі прывітаньні, казалі, што палітыка камуністычнай партыі правільная, аб чым сьведчыць рост прамысловасьці. Яны казалі: «Мы заўсёды пойдзем, куды нас павядзе камуністычная партыя». Усё гэта гаворыць аб тым, што гарадзкая партыйная арганізацыя мае ўплыў на рабочых, што рабочыя гарадзкога райёну ідуць за камуністычнай партыяй.

Гучныя воплескі доўга не давалі пачаць свой даклад сэкратару ЦК КПБ тав. Кнорыну аб унутры-партыйным становішчы. Пасьля гэтага дакладу гарадзкая канфэрэнцыя адзінадушна асудзіла апазіцыю.

Абраны новы гарадзкі камітэт з 31 члену і 13 кандыдатаў. Сэкратаром райкому КПБ(б) абран тав. Шэйман.

Я. З.

Вынікі перавыбараў бюро ячэек.

(Барысаўскі райён, Меншчына).

Папершае, трэба сказаць, што тэрмін для правядзеньня гэтай вельмі паважнай кампаніі быў кароткі, але, не зважаючы на гэта, ячэйкі досыць добра падрыхтаваліся, і перавыбары прайшлі з посьпехам.

Як дасягненьне можна лічыць амаль 100 проц. яўку партыйцаў на перавыбарныя сходы,—адсутнічаў толькі той, хто быў хворым, ці выехаў па справах службы.

Па справаздачах бюро і сэкратароў ячэек давалася шмат пытаньняў і была праўлена актыўнасьць у спрэчках. Трэба адзначыць, што пры абгаварэньні справаздачы ў большай частцы выступаўшыя таварышы ставілі пытаньні практычна, і выступленьняў абы пагутарыць ня было.

Поўнае захаваньне ўнутры партыйнай дэмакратыі і адсутнасьць выпадкаў няправільнага разуменьня самой дэмакратыі,—зьяўляецца таксама стаўчым баком у перавыбарнай кампаніі.

Перавыбары прайшлі пад лёзунгам ленінскага адзінства, і выступленьні апазіцыі рашуча асуджаліся ўсёй партыйнай масай, — спачуваючых апазіцыі ў Барысаўскай райённай арганізацыі не знайшлося.

Вынікі праведзенай практычнай працы і ўсіх кампаніяў сьведчаць аб тым, што аўтарытэт ячэек і ў цэлым арганізацыі сярод акаляючага насельніцтва значна падняўся.

Маецца за справаздачны перыяд дасягненьне і ў галіне росту арганізацыі, якая вырасла на 1 ячэйку і 2 кандыдацкія групы. Усе тыя практычныя мерапрыёмствы, якія намечаны парт'ячэйкамі на далейшы час, зьяўляюцца залогам далейшага росту і ўзмацненьня арганізацыі, а таксама і сплачэньня яе навакол Ленінскага ЦК.

В. Зайцаў.

Як ідзе падпіска на пазыку індустрыялізацыі.

ПА ФІНАНСАВЫХ УСТАНОВАХ.

На першым мейсцы—Галоўная Каса Ашчаднасьці.

Да 3 лістапада Галоўная Каса Ашчаднасьці рэалізавала пазыкі індустрыялізацыі на 77,675 руб., пры чым за апошнія два дні прынята падпіскі больш як на 16.000 руб.

Не адстае і Дзяржбанк.

Да ўчарашняга дня Беларускае аддзяленьне Дзяржбанку рэалізавала пазыкі на 64,000 руб. За 1 і 2-га лістапада было прынята падпіскі на суму каля 10.000 руб.

Тут слабей.

Камунбанк прыняў падпіскі ўсяго на 3380 руб.; паступіла і яшчэ неаформлена заяўка ад калектыву Белдзяржстрою на суму каля 3000 руб.

У т-ве ўзаемнага крэдыту.

Да 2-га лістапада ўключна т-ва ўзаемнага крэдыту рэалізавала пазыкі на 61.640 руб., галоўным чынам, праз індывідуальную падпіску.

ЯКІЯ КАЛЕКТЫВЫ ВЕЛЬМІ АДСТАЛІ.

Вельмі слаба ў ЦСУ.

Калектыў Цэнтральнай Статыстычнай Управы здаў падпіску ўсяго на 1020 руб., між тым як месячная пэнсія працаўнікоў—22358 руб.

Як-жа, таварышы, ці індустрыялізацыя краіны вас не датычыцца?

Ня лепш справа і ў ЦРК.

Месячная пэнсія калектыву Менскага ЦРК—26.000 руб., а падпіску здалі ўсяго толькі на 4000 руб. Відаць, мясцком слаба правёў кампанію. Траба падцягнуцца.

Ня вышла і 6 проц.

Калектыў Менскага Польвэдтэхнікуму здаў падпіскі ўсяго на 170 руб. і супакоіўся, а між тым пэнсіі атрымліваюць штомесяц 3134 руб.

Матаматыкі кажуць, што тут і 6 проц. месячнай зарплаты ніяк ня выходзіць.

Галоўлітбел 284 04

Краязнаўчая праца.

Лельчыцкае т-ва.

У мэтах папулярызацыі краязнаўства на сходах розных арганізацый райёнаў было зроблена 14 дакладаў. Папулярызавана краязнаўства пераважна сярод камсамольцаў, чым і тлумачыцца вялікі лік камсамольцаў у таварыстве, а ўласна 20 чалавек з 53 члены таварыства. Пры сямігодцы працуе краязнаўчы гурток. Таварыства мае бібліатэчку і шапіраграф. За час свае дзейнасьці таварыства сабрала толькі 272 словы сіламі школьнага гуртка і 10 членаў таварыства. Апрача гэтага, сабрана імі-ж 60 фальклёрных запісаў. Лебедзеў, Стасенка і Крахмалёк робяць фэналёгічныя нагляданьні, 11 абагульненьняў якіх паслана у акруговае т-ва. Яны-ж далі шмат іншых краязнаўчых матар'ялаў з райёну. Трэба ўцягнуць усю масу членаў т-ва ў краязнаўчую працу.

Кракоўскі.

Наш музэй.

(Магілеўская савпартшкола).

Сіламі нашага краязнаўчага гуртка за апошні час сабраны багаты краёвы музэй. У ім ёсьць розныя птушкі, як, напрыклад, совы, глухары і інш., а таксама жывёлы: зайцы, тхары, вожыкі і г. д. Прадстаўлены і нашы рыбы: вокунь, плотка і інш. У архэалёгічным аддзеле ёсьць старыя каменныя прылады, а ў нумізматычным вельмі шмат усялякіх старых і новых грошай. Наогул, наш музэй імкнецца адбіваць усебакова Магілеўшчыну і, калі праца будзе ісьці так, як дагэтуль, дык гурток краязнаўства гэтага дасягне.

А як справа з музэямі ў іншых прышкольных гуртках краязнаўства?

Д—нкі.

Мы пытаем Гомельскі акрвыканком.

Бяз веданьня свайго краю немагчыма будаваць гаспадарку яго, узмацняць уладу працоўных у ім, падвышаць культурны ўзровень працоўных мас яго. Вывучэньне кожнага краю ў Беларусі праводзіцца мясцовымі краязнаўчымі таварыствамі. Гэтыя таварыствы пабудаваны па прынцыпу калектыўнай працы, жадаючых вывучаць свой край. Такім чынам, гэта свайго роду мясцовыя акадэміі. У адным месцы яны лепшыя, у другім горшыя. Апошняе ў значнай меры залежыць ад адносін да таварыстваў краязнаўства мясцовых органаў улады. І ў нас, у Гомелі, ёсьць сваё акруговае таварыства краязнаўства. У сваёй дзейнасьці яно дасягнула значных посьпехаў, але пырока разгарнуць сваю працу не змагло, бо ня мае памяшканьня для працы і захоўваньня матар'ялаў. Праўда, нам было прапанавана памяшканьне ў падвале музэю і ў прахадным пакоіку аднае яколы, але-ж працаваць у іх немагчыма было.

Мы пытаем Гомельскі акрвыканком, ці праўда гэта, што для свайго таварыства краязнаўства зусім немагчыма знайсьці ў акруговым горадзе Гомлі два-тры пакоікі, каб даць магчымасьць таварыству разгарнуць працу?

П. І.

Заняпад у Віцебшчыне.

Раней наша акруговае таварыства краязнаўства праводзіла вельмі вялікую працу па дасьледаваньні і вывучэньні нашай акругі. Мясцовыя савецкія і партыйныя арганізацыі і ўстановы цікавіліся працаю таварыства і дапамагалі ёй. Але з вясны гэтага году дзейнасьць таварыства пачала занепадаць, а зараз і зусім прыціхла. Няма сэкцыйных сходаў, ня было ў пачатку году акруговай краязнаўчай канфэрэнцыі і нават праўленьне таварыства не паслала свайго дэлегата на пленум ЦБК, хоць выдаткі па ўтрыманьні дэлегата ЦБК брала на сябе. Трэба нашаму праўленьню падцягнуцца і аднавіць сваю шырокую чыннасьць.

Я. Ц.

Краязнаўчыя арганізацыі Мазыршчыны.

Азарыцкае таварыства.

Азарыцкае т-ва краязнаўства заснавалася ў верасьні 1926 г. Да гэтага часу ў складзе яго працуе 75 членаў. За год сваёй працы члены таварыства сабралі 2490 слоў жывой народнай мовы, 250 фальклёрных запісаў, апісалі 17 помнікаў старасьветчыны, прадставілі пісьмовае апісаньне досьледаў гліны ў пяці сельсаветах і 93 музэйныя рэчы. Апрача таго, запоўнілі 30 розных анкет і далі пяць монаграфій паселішчаў. Бюджэт таварыства складаўся з 63 руб. 50 кап. Мясцовыя прафэсыянальныя, партыйныя і савецкія арганізацыі значна дапамагалі працы таварыства. Ёсьць надзея, што і ў гэтым годзе дзейнасьць яго будзе ня менш прадукцыйнай.

Кулакоў.

Хроніка.

ШКОЛА ДЛЯ МЭДЫЧНЫХ СЯСЬЦЁР.

Цэнтральны камітэт Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу адчыняе ў Менску 3-х гадовую школу мэдычных сясьцёр. Мэта школы—падрыхтоўка кваліфікаваных мэдычных сясьцёр. У школу будуць прымацца асобы, скончыўшыя самігодку. Прымаюцца ў школу: работніцы, сялянкі, жанчыны--сябры прафсаюзаў, дзеці рабочых і сялян ва ўзросьце ад 18 да 35 гадоў. Бяднейшым будзе давацца стыпэндыі па 20 руб. у месяц і месца ў інтэрнаце. Пакуль што адшукана грошы на 30 стыпэндый.

Асобы, якія скончылі 3-хгадовую школу мэдычных сясьцёр, атрымаюць усе правы прафшколы і права паступленьня на 1-шы курс мэдфаку БДУ без экзаменаў.

Школа адчыніцца ў часе сьвяткаваньня 10-й гадавіны Кастрычніка.

Заявы прымаюцца да 15 лістапада.

АДЧЫНЕНЬНЕ ЗООЛЁГІЧНАГА МУЗЭЮ.

У памяшканьні б. архірэйскай царквы да 10 гадавіны Кастрычніка адчыняецца зоолёгічны музэй ІБК. У пасобных вітрынах расстаўлены шматлікія прадстаўнікі, галоўным чынам, дзікія птушкі Беларусі.

Сюды сабраны каштоўныя экзэмпляры арлоў, якія ладзяцца на абшарах БССР, чорнага бусла, журава, чайкі, розных гатункаў дзікіх качак, розных балотных, лясных, палявых птушак. Усяго ў музэі сабрана да 300 экспанатаў. Узімку маюць быць арганізаваны аддзелы рыб і сысуноў.

Адчыненьне музэю мае вялікае значэньне ў справе вывучаньня дзікай жывёлы Беларусі.

РЭГУЛЯТАРЫ РЫНКУ ПРАЦЫ НА ВЁСЦЫ.

Адным з відаў павялічэньня беспрацоўя—гэта прыток свабоднай рабочай сілы з вёсак. Часта сяляне, якія прыяжджаюць у горад, будучы незнаёмы са становішчам рынку працы, некарысна губляюць час і сродкі на праезд і пашуканьне працы. Для выдаленьня гэтай ненармальнасьці Наркампраны БССР арганізаваў у 1926-1927 г. у больш буйных райёнах 22 карэспандэнцкія пункты, якія значна дапамаглі рэгуляваньню прытоку беспрацоўных у горадзе. У бягучым годзе дзякуючы вялікай ролі карэспандэнцкіх пунктаў Наркампрацы БССР намеціў павялічыць лік да 30. Гэта дасьць магчымасьць больш правільна выкарыстаць прыток вольнай рабочай сілы з вёскі ў горад.

50.000 руб. на пабудову халадзільніка.

Менскі аддзел камунальнай гаспадаркі з свайго бюджэту выдзеліў 50.000 руб. на пабудову ў Менску халадзільніка.

Забесьпячэньне школ бібліятэкамі.

Наркамасьветы зьвярнуўся ў Савет Народных Камісараў БССР з хадайніцтвам аб водпуску 10000 руб. на дадатковую рассылку кнігак на школьных бібліятэках.

Выстаўка працалектываў.

Да дзён кастрычнікавых сьвят кіраўніцтва менскімі працалектывамі рыхтуе выстаўку вытворчасьці апошніх. На выстаўцы будуць прадстаўлены 18 пасобных вытворчасьцей. Асабліва будуць цікавы экспанаты мастацка-ганчарнай вытворчасьці г. Барысава. Выстаўка адчыніцца 6 лістапада і працягнецца тыдзень. Пасьля заканчэньня выстаўкі больш цікавыя экспанаты будуць перададзены ў музэй прамысловасьці ВСНГ.

Агітацыйна-прапагандысцкая праца Мопр'у.

За 5 год існаваньня Цэнтральны камітэт Мопр'у Беларусі правёў 6 курсаў мопраўскага актыву. Апрача гэтага, зараз налічваецца 44 гурткі Мопр'у, 28 груп галоснай чыткі і каля 500 куткоў Мопр'у.

СПРАВА ДОКТАРА ЛЬВОВІЧА БУДЗЕ ПЕРАГЛЕДЖАНА.

(Да забойства т. Апанскага).

7 чэрвеня а 7-й гадзіне вечара на блізкай адлегласьці ад ст. Ждановічы ад злачынной рукі здарылася прушэньне аўтадрэзіны Дзяржаўнай Палітычнай Управы, на якой ехалі т. Апанскі і іншыя супрацоўніці Управы, якія саправаджалі польскага шпіёна. У выніку крушэньня былі цяжка паранены т.т. Апанскі Голуб і іншыя супрацоўніці паранены лёгка. Калі аб гэтым было паведамлена ўрачу ждановіцкага дома адпачынку Львовічу, то апошні на месца здарэньня для аказаньня мэдыцынскай дапамогі не зьявіўся.

Менскі акруговы суд прыгаварыў доктара Львовіча на год зьняволеньня без пазбаўленьня ў правах.

Прысуд гэты на пратэсту памоцніка пракурора рэспублікі і пракурора вярхоўнага суду быў перагледжан 1 лістапада гэтага году крымінальна-касацыйнай калегіяй Вярхоўнага Суду, якая знайшла, што злачынства Львовіча кваліфікавана няправільна, і што абраная судом мера пакараньня Львовіча не адпавядае зробленаму праступленьню, у выніку чаго прыгавор акруговага суду цалком адмяніла.

Пленум Вярхоўнага Суду, маючы на ўвазе, што злачынства мае палітычны характар, ухваліў: справу па абвінавачаньні Львовіча прынясьці да свайго разгляду і заслухаць 4 лістапада г. г. а 6-й гадзіне вечара ў залі судовых пасяджэньняў акруговага суду.

Справа будзе слухацца пад старшынствам члена Вярхоўнага Суду Неесьцера; абвінавачаньне падтрымлівае пам. пракурора рэспублікі Міхайлаў, абаранае Львовіча абаронца Корсак.

Д. Кастроў.

Да таварышоў, якія скончылі Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт—дзіця Кастрычнікавай рэвалюцыі, нарадзіўшыся ў выніку нерамог рабочых і сялян над капіталістымі і панамі. БДУ у працягу 6 год праводзіў упартую працу на культурным і эканамічным адраджэньні Савецкае Беларусі.

У мурох БДУ навучаецца больш 3-х тысяч студэнцтва, абсалютная большасьць якіх зьяўляецца выхадцамі з рабочых і сялян і нэрагам ніцяў зьвязана з шырачэйшымі працоўнымі гушчамі.

У кузьнях БДУ выкоўваюцца ня толькі спэцыялістыя розных галін гаспадаркі—пэдагогі, урачы, юрыстыя, але і добрыя грамадзкі, якія па сканчэньні згодны аддаць усю сваю сілу на справу сацыялістычнага будаўніцтва.

БДУ—асродак навуковай палітвыхаваўчай працы БССР.

Да 10-годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі будуць падводзіцца вынікі вялізарнай працы, праведзенай Унівэрсытэтам за 6 год свайго існаваньня, а таксама намячацца шляхі далейшага яго ўзмацаваньня і разьвіцьця.

Адным з мерапрыёмстваў, якое адбудзецца 6-га лістапада г. г., зьяўляецца закладка унівэрсытэцкага гарадка. Гэта—акт вялізарнай урачыстасьці для працоўных СССР.

Асабліва гэта мерапрыёмства павінна цікавіць тых, якія ў працягу шэрагу год працавалі над пабудовай БДУ і для каго ён служыў крыніцай атрыманьня ведаў для сучаснай практычнай працы.

Праўленьне і выканбюро прафсэкцый студэнтаў Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту лічаць пажаданым прысутнасьць на ўрачыстасьцях закладкі гарадка студэнтаў, скончаўшых Унівэрсытэт, і запрашаюць іх прыехаць на ўрачыстасьць з розных куткоў БССР.

Праўленьне БДУ.
Выканбюро прафсэкцый студэнтаў.

Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту Беларускае Савецкае Рэспублікі

АД ПЛЕНУМУ СЬВЯШЧЭННАГА СІНОДУ БЕЛАРУСКАЕ ПРАВАСЛАЎНАЕ ЦАРКВЫ

прывітаньне.

Пленум Беларускага Сьвяшчэннага Сіноду, які ўпяршыню сабраўся ў сталічным горадзе роднай рэспублікі, лічыць сваім сьвяшчэнным абавязкам выказаць Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту глыбокую падзяку за ўважлівыя адносіны да патрэб праваслаўнай беларускай царквы і, між іншым, за дазвол гэтага сходу.

Пленум усядамляе вітае Цэнтральны Выканаўчы Камітэт в надыходзячым 10-годзьдзем Кастрычнікавай рэвалюцыі, якая вызваліла прыгнечаных у СССР, і заклікае да таго самага і ўвесь сьвет, а праваслаўнай царкве дала магчымасьць самастойна, без дзяржаўнага націску вырашаць свае ўнутраныя справы.

Пленум, молячы бога аб дараваньні нашаму краю глыбокага і нечарушнага міру, жадае дзяржаве нашай пагыбленьня і пашырэньня сацыялістычнага будаўніцтва для дабра народаў, якія жывуць у ёй, на славу БССР, нехай будзе яна маяком для ўсіх прыгнечаных сьвету на шляху да вызваленьня з пад ярма капіталізму, і імперыялізму а для нашых замежных братоў месцам уцехі і спакою ад прыгнёту палёнізму.

Старшыня Беларускага Сьвяшчэннага Сіноду Беларускай Праваслаўнай Царквы—Іосіф, мітрапаліт Магілеўскі і Беларускі.

Сябры Сьвяшчэннага Сіноду:
Даніла, архіяпіскап Менскі і Тураўскі.
Міхаіл, архіяпіскап Віляйска-Высачанскі.
Сяргей, архіяпіскап Полацкі і Себескі.
Япіскап Саваты.
Япіскап Капітон.
Ераманах Васыян.
Пратаярэй Л. Камянецкі.

Міранін (подпіс).

Сэкратар пратаярэй Петр Шыжкевіч.

26 кастрычніка 1927 г.,
г. Менск.

СУД.

УЧЫНКІ СТАРШАГА МІЛІЦЫЯНЭРА ВЕРАБ'ЁВА.

Выязная сэсія Бабруйскага акруговага суду ў Рагачове разглядзела справу старшага міліцыянэра Вераб'ёва Максіма, які зрабіў шэраг злачынстваў на службе. Суд прыгаварыў Вераб'ёва на 5 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем. Асуджаны падаў касацыйную скаргу ў Вярхоўны Суд, але апошні пакінуў прыгавор у моцы, а касацыйную скаргу Вераб'ёва бяз вынікаў.

Вераб'ёў зрабіў наступныя злачынствы:

Сабралася цёплая кампанія. Пайшлі ў піўнушку. Пасьля гаю, як усе ўжо добра выпілі, з вачыма Вераб'ёва зрабілася дрэнна: ён стаў бачыць розныя страшныя рэчы ў дымных навотры піўной. Яму здавалася, што ўсе яго ворагі сабраліся ў адну групу, як на фатаграфіі, лётаюць у навотры і вышчыраюць на Вераб'ёва зубы.

Вераб'ёў зірнуў у вакно, і яму паказалася, што пехта адтуль глядзіць на яго. Схапіўшы за шыйку піўную бутэльку, Вераб'ёў размахнуўся і бахнуў у вакно.

На другі дзень Вераб'ёў прышоў да ўласьніцы піўной Жаўлаковай і кажа:

— Даражэнькая, выбачай, што я тут учора накуралеіў. Заплачу за ўсё: за бутэльку, за шыбы.., толькі маўчы.

І Вераб'ёў заплаціў Жаўлаковай за ўсё.

Вераб'ёў рэдка калі быў цьвярозы. І на гэты раз ён быў п'яны і, седзячы на возе, ківаўся. Яго спадарожнікі—лясьнік Гушчаноўскі і Пілішенка—на чарзе падсмейваліся над Вераб'ёвым.

Пілішенка шмаргане яго пугаю па зашыйку, а пасьля з сур'ёзным відам кажа:

— Ну, і візка-ж у гэтым лесе гальё расьце: так і шморгае на шапцы, проста праехаць нельга.

Вераб'ёў верыў, а спадарожнікі сьмяяліся.

Калі «гальё» добра нацерабіла шыю Вераб'ёву, ён раззявауся і шукаў прычыны, каб на кім-небудзь сагнаць злосьць.

Тут ехалі з дрывамі сяляне Арцём Астапаў і Самён Ланіцкі, на якіх Вераб'ёў і накінуўся. Пабіўшы іх, Вераб'ёў загадаў везьці дровы ў вёску Старое-Мазылава. Тут чаранком рэвальвэра ён аднавіў бойку зноў.

Быў яшчэ адзін выпадак з рагачоўскім звозчыкам Баскіным, і гэты выпадак таксама ўляпаў Вераб'ёва ў брудную гістарыю.

С. Азерскі.

ЗА СПРОБУ АБРАБАВАЦЬ.

Гомельскі акруговы суд прыгаварыў Пётру Хрычакова на 3 гады зьняволеньня з суровым адмежаваньнем за тое, што ён у Гомелі на вуліцы хацеў абрабаваць гр-ку Кірзон. Апошняя падняла крык, зьбегліся людзі, і абрабаваць не ўдалося. Хрычакоў ударыў гр-ку Кірзон некалькі раз рэвальвэрам і скаваўся.

ХАЦЕЛА ПРЫМУСІЦЬ ДА КАХАНЬНЯ,

Да М. Маркавай заляцаўся Самуіл Агурцоў, а пасьля яе пакінуў. Жадаючы адамсьціць яму за гэта, Маркава падмовіла зладзеяў-рэцыдывістаў Галубёва і Жыглінскага, каб яны абрабавалі Агурцова. Апошнія згадзіліся. У часе рабунку яны паранілі стрэламі старога Агурцова і яго сына. Віцебскі акруговы суд прыгаварыў Галубёва і Жыглінскага на 10 год зьняволеньня, а М. Маркаву на—2 гады з суровым адмежаваньнем.

ПАСТАНОВЫ і ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб скасаваньні кары сьмерцю (растрэлу) за некаторыя злачынствы.

Маніфэстам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР ад 15-га кастрычніка 1927 г. прымяненьне пакараньня сьмерцю ў якасьці меры сацыяльнае абароны выключана з Крымінальных Кодэксаў Саюзных Рэспублік па ўсіх справах, апроч спраў па злачынствах дзяржаўных, вайсковых і ўзброеным разбоі („Известия ЦИК ССР и ВЦИК РСФСР" ад 16 кастрычніка 1927 г. № 238). Паводле гэтага прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Пакараньне сьмерцю (растрэл), як меру сацыяльнае абароны скасаваць за ўсе злачынствы, апроч злачынстваў дзяржаўных, вайсковых і ўзброенага разбою.

2. Скасаваньне пакараньня сьмерцю распаўсюджваецца як на справы ягчэ не разгледжаныя, гэтак і на тыя, па якіх хоць прыгаворы і вынесены, але ягчэ ня выкананы.

3. Вышэйшай мерай сацыяльнай абароны, якая павінна замяніць пакараньне сьмерцю, лічыць пазбаўленьне волі са строгай ізаляцыяй тэрмінам на дзесяць год.

4. Па справах, на якіх прыгаворы, з прымяненьнем пакараньня сьмерцю, ужо вынесены, але ягчэ ня выкананы, замена пакараньня сьмерцю, на падставе гэтае пастановы, пазбаўленьнем волі робіцца судом, які вынес прыгавор, або касацыйнай інстанцыяй, калі справа знаходзіцца на яе разглядзе.

5. Даручыць СНК распрацаваць і ўнесьці ў праект Крымінальнага Кодэксу БССР зьмены, якія выцякаюць з гэтае пастановы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

27 кастрычніка 1927 году.
г. Менск.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра датэрміновае скасаваньне дагавораў на адданую ў аренду дзяржаўную зямельную маемасьць.

На падставе пастановы IV сэсіі ЦВК БССР VI скліканьня за 7 лютага 1925 году „Аб захадах па дадатковым надзяленьні зямлёю безьзямельных і малазямельных сялян" (З. З. БССР 1925 г. № 8, арт. 66) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Уся дзяржаўная зямельная маемасьць мясцовага значэньня, якая знаходзіцца ў арэндным карыстаньні, павінна быць перадана ў працоўнае карыстаньне безьзямельнаму і малазямельнаму сялянству.

Увага. У пасобных выпадках акруговыя выканаўчыя камітэты могуць паводле дырэктыў Народнага Камісарыяту Земляробства пакідаць пасобныя зямельныя дзялянкі і іншыя ўгодзьдзі ў арэндным карыстаньні.

2. Арэндныя дагаворы на дзяржаўную зямельную маемасьць, якая паводле артыкулу 1 гэтае пастановы належыць да перадачы безьзямельнаму і малазямельнаму сялянству, касуюцца адпаведнымі райённымі выканаўчымі камітэтамі.

3. Калі арандатар дзяржаўнае зямельнае маемасьці, якая паводле артыкулу 1 гэтае пастановы належыць да перадачы безьзямельнаму і малазямельнаму сялянству, мае права на надзяленьне зямлёю ў першую чаргу, то на яго ходайніцтву ён павінен быць надзелены зямлёю з тае дзялянкі, якую ён арандаваў.

4. Страты арандатараў, якія могуць быць пры датэрміновым скасаваньні дагавораў з прычыны няпоўнага скарыстаньня імі зробленых палепшаньняў у арандаванай маемасьці, выплачваюцца арандатарам тымі асобамі, у карыстаньне якіх гэта маемасьць пераходзіць.

5. Разьмер прадугледжаных артыкулам 4 гэтае пастановы страт вызначаецца апэначнымі камісіямі пад старшынствам члена райённага выканаўчага камітэту, які ведае зямельнымі справамі, у складзе райённага агранома і прадстаўніка фінансавае часткі райённага выканаўчага камітэту і зацьвярджаецца райённым выканаўчым камітэтам. Скаргі на пастановы райённага выканаўчага камітэту канчаткова вырашаюцца акруговым выканаўчым камітэтам.

6. Кампэнсацыя за нескарыстаныя арандатарамі палепшаньні (арт. 4) павінна быць выплачана ім новым карыстальнікам адабранае ў арандатара маемасьці.

7. Пасобным беднейшым сялянскім гаспадаркам для выплаты прадугледжанай арт. 4 гэтае пастановы кампэнсацыі дасцца Белсельбанкам доўгатэрміновы крэдыт.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

27 кастрычніка 1927 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

об отмене смертной казни (расстрел) за некоторые преступления.

Манифестом Центрального Исполнительного Комитета Союза ССР от 15-го октября 1927 г. применение смертной казни в виде меры социальной защиты исключено из Уголовных Кодексов Сою